Комуністычная партыя (большэвікоў) Беларусі

ЗВЯЗДА

Орган ЦК і МК КП(б)Б, ЦВК і СНК БССР

№ 287 (5120)
СНЕЖНЯ
23
НЯДЗЕЛЯ
1934 г.
год выдання XVII

Пролетарыі ўсіх краін, злучайцеся!

ПРЫГАВОРЫ ПА АБВІНАВАЧАННЮ У КОМУНІСТЫЧНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ У ПОЛЬШЧЫ

ВАРШАВА, 22 снежня (БЕЛТА). На працягу апошніх двух тыдняў у розных месцах Польшчы вынесен рад судовых прыгавораў па абвінавачанню ў актыўнай комуністычнай дзейнасці.

Суд у Тарнопалі заслухаў справу 13-ці, якія абвінавачваюцца ў прыналежнасці да комуністычнай партыі, 11 з іх прыгавораны да розных тэрмінаў турэмнага зняволення, ад 2 да 9 год кожны. Двое з названай групы ўцялі ю з турмы да суда.

«Газета Варшаўска» паведамляе, што акруговы суд ў Сасноўцах прыгаварыў нейкага Файнера да трох год турэмнага зняволення з пазбаўленнем праў на 3 год. Як гаворыць, апублікаванае ў газетах паліцэйскае паведамленне, у Файнера ў Бендзіне (Верхняя Сілезія) быў знойдзен склад нелегальнай комуністычнай літаратуры, прычым пры вобыску нібыта было адабрана 17.000 адозваў, кніжкі для збору ахвяраванняў у карысць МОПР і інш. Комуністычнай літаратурай—гаворыць гэта паведамленне—быў затоплен велізарны раён. Комуністычная літаратура пранікла таксама ў казармы. У часе допыту Файнер адмовіўся даваць якія-б там ні было паказанні.

ТРОЙЧЫ ПРЭЗРЭННЫЯ

Не другі дзень пасля стрэлу ў Смольным, урад і Цэнтральны Камітэт партыі аб'явілі ўсяму народу нашай краіны, што таварыш Кіраў — палкі трыбун рэвалюцыі, адзін з выдатных кіраўнікоў большэвікоў, аддаўшы ўсё сваё яркае слаўнае жыццё справе комунізма — забіт злодзеем, падасленым класавым ворагам.

Ужо ў пачатку следства стала вядома, што гэты злодзей належыць к подлым падонкам былой зіноўеўскай апазіцыі.

Публікуемае сёння паведамленне Народнага Камісарыята ўнутраных спраў СССР устанаўляе факты звязаныя з забойствам таварыша Кірава.

«Расследаваннем устаноўлена, — гаворыцца ў паведамленні, — што Л. В. Нікалаеў, зрабіўшы 1-га гэтага снежня ў Смольным сваё гнуснае злачынства, з'яўляўся членам тэрарыстычнай падпольнай антысавецкай групы, якая стварылася з ліку ўдзельнікаў былой зіноўеўскай апазіцыі ў Ленінградзе.

Устаноўлена, што забойства тав. Кірава было зроблена Нікалаевым па даручэнню тэрарыстычнага падпольнага «Ленінградскага цэнтра», пераданому яму членам і адным з кіраўнікоў гэтага цэнтра Каталынавым І. І.».

Забойцы большэвіка Кірава ў розны час выключаліся з партыі за прыналежнасць к былой антысавецкай зіноўеўскай апазіцыі. Большасць з іх была адноўлена ў правах членаў партыі пасля іх афіцыяльнай заявы аб поўнай салідарнасці з партыйнай партыі і совецкай улады.

Няма межаў жалобы, якая ахапіла нас пры мысліі, што партыя і рабочы клас назаўсёды страцілі найлепшага, мілага, заўсёды жыццерадаснага Міроныча. Цяжке падазрэнне словы, якія-б да канца выражалі ўсю сілу нашага найглыбейшага абурэння к подлым і паганым забойцам.

Забойцы таварыша Кірава аказаліся гнусныя агенты класавага ворага, прастытуераныя мярзаўцы, жаадныя агідніці, трусы і здрадні.

Забойцы таварыша Кірава і іх натхніцелі гісторыя прыгаворыць да ганебнага слупа адзначэнцаў ча павечнага роду. Імёны іх будуць з прэкрасцем вымаўляцца ў вяках.

Не выпадкова аказаўся рэвальвер у руках Нікалаева. Не выпадкова раздаўся ў Смольным стрэл аднаго з паследнаў зіноўеўскай апазіцыі.

Зіноўеў, Каменеў... Еўдакімаў, Залуцкі... Бакаеў, Кукліч... Каталынаў, Румянцэў... Шатскі, Топмазаў... гэтыя імёны яшчэ раз напамінаюць партыі і комсамолу аб доўгагадовай двурушніцкай антыпартыйнай контрэвалюцыйнай рабоце зіноўеўскай апазіцыі.

Гэта апазіцыя мае сваю гісторыю, поўную чорных старонак, поўную здрадніцкіх выпадзак супроць партыі яшчэ напярэдадні Окцябрскай социялістычнай рэвалюцыі. Зіноўеў і Каменеў жорстка выступалі супроць Леніна, прабавалі нанесці ўдар у спіну партыі, унесці замяшанасць у рады пролетарыята, ішоўшага на штурм буржуазіі. Гэту лінію падрыву магутнасці нашай партыі яны прадаўжалі ва ўсе далейшыя гады пабеданосной социялістычнай рэвалюцыі.

На кожным рашаючым этапе рэвалюцыі Зіноўеў і Каменеў, раскрывалі свой сапраўдны твар дробных, абанкрутаваўшых палітыканаў, капітулянтаў і дэзэрціраў з фронта класавай барацьбы пролетарыята. І ўсякі раз, пацярпеўшы жорсткае паражэнне, атрымаўшы рашучы адпор з боку партыі і рабочага класа, гэтыя штрэйкбрэхеры надзявалі на сябе пічыну смірэння і пакорлівасці, акуратна каліліся ў сваіх памылках і таксама акуратна прадаўжалі цішком сваю гнусную справу на шкоду рэвалюцыі, на радасць ворагам.

Яны заключалі бяспрынцыпныя блокі з іншымі антыпартыйнымі апазіцыямі, з контрэвалюцыйнымі групамі, яны ішлі на паклон к мен шавіку Троцкаму. Яны дзень за днём скалочвалі сваю тайную арганізацыю і ўцягвалі у яе выпадковыя, няўстойлівыя і разлажыўшыяся элементы ў партыі і комсамоле. Яны абгрунтавалі сябе настаўнікамі моладзі і мізэрнай групцы яе прышаплялі пачуццё жывёльнай нянавісці к партыі і совецкай уладзе, к правадырам рэвалюцыі.

Стрэл бруднага агента зіноўеўскай апазіцыі ў таварыша Кірава—стойкага барацьбіта за генеральную лінію партыі — ушчэнт разбіўшага ідэйна і палітычна ленінградскую групу былых зіноўеўцаў — гэты стрэл паказаў, хто ўлажыў зброю ў рукі Нікалаева.

Ад дарэмных спроб сказіць вучэнне Маркса-Леніна, дыскрэдытаваць ленінскае кіраўніцтва партыі, ад дарэмных спроб пахіснуць жалезнае адзінства большэвіцкіх радоў — к прамой здрадзе справе рабочага класа, к выкананню социяльнага заказу класавага ворага, к натхненню ўсіх варожых нам фашысцкіх сіл, к стварэнню падпольнай антысавецкай тэрарыстычнай групы — такава логіка фракцыйнай барацьбы.

«Следства высветліла — гаворыцца ў паведамленні Наркамата ўнутраных спраў, — што матывамі забойства тав. Кірава з'явілася імкненне гэтай падпольнай антысавецкай групы дэзарганізаваць кіраўніцтва совецкага ўрада шляхам тэрарыстычных актаў, накіраваных супроць галоўных кіраўнікоў совецкай улады і дабіцца такім шляхам змянення цяперашняй палітыкі ў духу так званай зіноўеўска-троцкісцкай платформы...

...Гэта антысавецкая група прадстаўляла сабою замкнутую групу, страціўшую ўсякую надзею на падтрыманне мас, палітычна асуджаную і стаўшую, з прычыны безнадзейнасці ажыццяўлення сваіх мэт, на шлях тэрору».

Зусім-жа яшчэ нядаўна з вялікай трыбуны XVII з'езда партыі гневары зіноўеўцаў тройчы кляліся ў вернасці партыі, у прызнанні сваіх памылак.

Тройчы прэзрэнныя!

Меч пролетарскай рэвалюцыі бязлітасны к ворагам, к здрадніцам нашай вялікай радзімы. Мы ідзем шматмільённай калонай, узброеныя вучэннем Маркса-Энгельса-Леніна-Сталіна, мы ідзем пад вадзіцельствам найвялікшага правадыра працоўных — Сталіна ўсё к новым і новым перамогам у барацьбе за комунізм. І нішто і ніхто не можа спыніць наша пабеданосное шэсце.

На мерзкую выпазку ворага, на трусліва гнусны стрэл з-за вугла, мы, верныя сыны нашай радзімы, адказваем упэртай працай па варштата, на калгасных палях, у вугольных шахтах і на нафтавых вышках па мартэнаў і ў навуковых лабараторыях — на ўсіх участках социялістычнага будаўніцтва. І няхай ведае злобствуючы недабіты вораг, і няхай ведаюць мізэрныя асколкі разгромленых антыпартыйных груп, што наша краіна, наша партыя, наша ўлада моцны зараз як ніколі, што яны змятуць з зямлі ўсіх, хто пасягне на свяшчэнныя завяванні рабочых і калгасных мас, на лепшых людзей вялікага Совецкага Саюза.

(Перадавы артыкул «ПРАВДЫ»).

Прывітанне пленума менскага горсовета таварышу Сталіну

Дарагі Іосіф Вісарыёнавіч!

К табе, мужнаму і вялікаму зодчаму нашай социялістычнай краіны, чыё кіраўніцтва і настойлівыя клопаты забяспечылі найвялікшыя поспехі будаўніцтва социялізма, рост добрабыту працоўных нашай вялікай радзімы, бурны рост гаспадаркі і культуры ў нацыянальных рэспубліках, абласцях і раёнах, звернута першая наша мысль дэпутатаў новавыбранага Менскага гарадскога совета сталіцы Совецкай Беларусі.

Пад знакам найвялікшага ўзнёму, безраздзельнай любві рабочых мас к сваёй роднай рабоча-сялянскай уладзе, сваёй роднай комуністычнай партыі, свайму роднаму, любімаму правадыру і настаўніку таварышу Сталіну прайшлі выбары совецтаў у нашым горадзе, як і ва ўсім вялікім СССР.

Гэта знайшло сваё выражэнне ў тым, што на ўсіх сходах з агромадным энтузіязмам першыя дэпутатам у Менск гарадскі совет выбралі цябе, наш дарагі таварыш Сталін.

Мы, дэпутаты горсовета, запэўніваем цябе, дарагі Іосіф Вісарыёнавіч, што прыкладзем усе свае сілы, усю сваю большэвіцкую палкасць, увесь энтузіязм будаўнікоў новага социялістычнага грамадства, каб па-большэвіцку ажыццяўляць ленінска-сталінскую нацыянальную палітыку — ператварыць горад Менск ва ўзорную за ўсіх адносінах сталіцу, з Совецкую Беларусь у непрыступны фарпост СССР.

Жалкія праклятыя падонкі разбітай у адкрытай барацьбе зіноўеўскай антыпартыйнай групы, бясільныя і азлаблёныя, прыбягаюць к апошняму белабандыцкаму фашысцкаму сродку — тэрору. Спрабуючы ў тав. С. М. Кірава, лепшага з лепшых прадстаўнікоў сталінскай плеяды большэвікоў-кіраўнікоў, яны хацелі ўнесці замяшанне ў нашы сталёвыя рады.

Але няхай ведаюць ворагі, што гэта цяжкая ўтрата яшчэ больш загартавала і згуртавала нашы рады. Светлы вобраз тав. С. М. Кірава будзе заўсёды нас натхняць у вялікай барацьбе.

К бязлітаснай расправе, к грозной помсце за смерць т. Кірава, к бязлітаснаму выкарчоўванню астатка каў разгромленых ворагаў клічуць працоўныя горада Менска разам з мільёнамі пролетарыяў і працоўных усяго свету.

Яшчэ вышэй узнімем пільнасць у нашых радах, больш зорка будзем сачыць за прошукамі класавых ворагаў, яшчэ больш умацуем пролетарскую дыктатуру і да канца без астатку выкарчуем контрэвалюцыйныя падонкі былых зіноўеўцаў і ўсякіх ворагаў рабочага класа.

Ад імя працоўных сталіцы БССР запэўніваем цябе, дарагі таварыш СТАЛІН, што і надалей г. Менск будзе стаяць на перадавых пазіцыях абароны нашай вялікай радзімы ад усіх пасягання ворагаў, будзе трымаць высока і несці ўперад вялікі чырвоны непераможны сцяг Окцябрскай социялістычнай рэвалюцыі.

Няхай жыве наша слаўная пабеданосная партыя Леніна-Сталіна!

Няхай жыве наш родны вялікі Сталін!

ПРЭЗІДЫУМ ПЛЕНУМА.

ЦВК СССР—тав. КАЛІНІНУ, СНК СССР—т. МОЛАТАВУ

Новавыбраны пленум Менскага гарадскога совета ад імя рабочых, калгаснікаў і ўсіх працоўных гор. Менска шле вам шчырае пролетарскае прывітанне.

Наш пленум сабраўся на рубяжы новага гаспадарчага года, у момант, калі наша партыя і ўрад вынесці гістарычнае рашэнне аб адмене картачнай сістэмы і разгортванні вольнага гандлю хлебам і іншымі сельскагаспадарчымі прадуктамі. Гэта рашэнне, накіраванае на далейшае паляпшэнне матэрыяльна-бытавых умоў працоўных і ўмацаванне магутнасці нашай радзімы, працоўныя сустралі з агромадным энтузіязмам і новым уздымам творчай волі к новым перамогам.

Запэўніваем наш рабоча-сялянскі ўрад, што ўсю сілу, энергію і ініцыятыву прыкладзем для паспяховага выканання, пад кіраўніцтвам нашай партыі і ўрада, ускладзенай на нас вялікай і ганаровай задачы па ператварэнню горада Менска ва ўзорную культурную сталіцу БССР.

Яшчэ непаражытая гора, якое пасцігла нашу партыю і ўсю краіну Совецтаў,—забойства Сергея Міроновіча Кірава подлымі падонкамі былой антыпартыйнай зіноўеўскай групы—ускладае на нас, дэпутатаў гарадскога совета, баявую задачу — вышэй узняць нашу класавую пролетарскую пільнасць, з усёй сілай рэвалюцыйнай законнасці знішчыць ворагаў пролетарскай дзяржавы.

Мы жывем на мяжы з капіталістычным Захадам.

Усе намаганні нашы будуць накіраваны на ўмацаванне абароназдольнасці нашай краіны, на абарону совецкіх межаў. Ператворым нашы заводы, фабрыкі і калгасы ў крэпасці абароны.

Будзем вышэй трымаць сцяг партыі Леніна-Сталіна.

Вышэй пролетарскую пільнасць!

Няхай жыве ЦК ВКП(б) і геніяльны рулявы сусветнай пролетарскай рэвалюцыі наш дарагі таварыш Сталін!

Няхай жывуць лепшыя сяратнікі вялікага Сталіна тт. Молатаў і Калінін!

ПРЭЗІДЫУМ ПЛЕНУМА.

ЖАЛЕЗНАМУ НАРКОМУ АБАРОНЫ КЛІМУ ВАРАШЫЛАВУ

Пленум Менскага гарадскога совета рабочых, сялянскіх і чырвонагармейскіх дэпутатаў шле ў тваёй асобе палкае большэвіцкае прывітанне нашай роднай непераможнай рабоча-сялянскай Чырвонай арміі.

У гэтыя дні мы адзначаем 15-ю гадавіну з тых пор, калі пад агульным геніяльным вадзіцельствам вялікага Леніна, на аснове сталінскага стратэгічнага плана слаўныя чырвоныя палкі, вадзімыя Варашыловым-Будзённым, пры актыўным падтрымані працоўных усіх нацыянальнасцей канчаткова ачысцілі тэрыторыю Совецкага Саюза ад белагвардзейскіх банд Дзянікіна-Врангеля, белапалякаў, прабавуўшых аднавіць уладу памешчыкаў - капіталістаў, і назаўсёды замацавалі сваю ўладу — уладу Совецтаў.

Незабываемы для нас гэтыя слаўныя гераічныя дні.

Але няхай аб іх не забудуць і нашы класавыя ворагі.

Гора таму, хто ў сваёй звярынай нянавісці прабуе подлымі стрэламі з-за вугла парушыць мірную працу нашай социялістычнай радзімы.

Наша магутная, тэхнічна аснашчоная Чырвоная армія, пры актыўным падтрыманні дзесяткаў мільёнаў працоўных вялікай социялістычнай радзімы і ўсяго свету, раздушыць у зародку кожную спробу імперыялістычных драпежнікаў парушыць межы Совецкага Саюза.

Яшчэ цясней згуртоўваючы нашы рады вакол вялікага Сталіна, павышаючы нашу рэвалюцыйную пільнасць і класавую зоркасць, мы будзем з усёй бязлітаснасцю ліквідаваць усіх гнусных і каварных ворагаў, пад якімі-б маскамі яны не хаваліся ад караючай рукі пролетарскай дыктатуры.

Мы будзем і надалей зорка стаяць на варце совецкіх рубяжоў, з гонарам выканаем баявы пункт наказу нашых выбаршчыкаў па далейшаму ўзмацненню Чырвонай арміі і ўмацаванню абарончай магутнасці першай у свеце краіны пролетарскай дыктатуры.

Няхай жыве наша родная непераможная рабоча - сялянская Чырвоная армія і яе жалезны нарком Клім Варашылаў!

Няхай жыве наш родны вялікі Сталін!

ПРЭЗІДЫУМ ПЛЕНУМА.

ПЕРШАМУ З'ЕЗДУ СОВЕТАЎ ЯЎРЭЙСКАЙ АЎТАНОМНАЙ ВОБЛАСЦІ

Новавыбраны гарадскі совет горада Менска, сабраўшыся на свой першы пленум, шле гарачае прывітанне першаму з'езду Яўрэйскай аўтаномнай вобласці Біраібіджане і ў яго асобе ўсім рабочым і працоўным вобласці.

Факт існавання Біраібіджана і разгортвання социялістычнага будаўніцтва ў Яўрэйскай аўтаномнай вобласці з'яўляецца адным з найярчэйшых сведчанняў трыумфа ленінска-сталінскай нацыянальнай палітыкі, палітыкі, якая будуецца не магутным базісе інтэрнацыянальнай згуртаванасці рабочых і працоўных усіх нацый і народаў Саюза Совецкіх Социялістычных Рэспублік. Ваш з'езд з'яўляецца ўвасабленнем актыўнай социялістычнай творчасці яўрэйскіх працоўных, якія раней прыгняталіся царызмам. Ваш з'езд з'яўляецца сімвалам надзеі для зараз прыгнечаных у краінах капітала і фашызма яўрэйскіх рабочых і працоўных.

Няхай жыве комуністычная партыя, якая нясе высока сцяг рэвалюцыйнага вызвалення працоўных усіх народаў!

Няхай жыве правадыр партыі, любімы рабочымі і працоўнымі ўсіх народаў свету таварыш Сталін!

Няхай жыве Яўрэйская аўтаномная вобласць — непадзельная частка вялікай социялістычнай радзімы!

ПРЭЗІДЫУМ ПЛЕНУМА.

Пленум таксама паслаў прывітанні ЦК КП(б)Б—т. ГІКАЛО, ЦВК БССР—тав. ЧАРВЯКОВУ, СНК БССР—тав. ГАЛАДЗЕДУ

ГЕРАІЧНАЯ БАРАЦЬБА КІТАЙСКАЙ ЧЫРВОНАЙ АРМІІ

Чырвоная армія прарвала фронт нанкінскіх войск

ТОКІО, 21 снежня (БЕЛТА). Карэспандэнт газеты «Асахі» паведамляе, што наступаючыя ў напрамку правінцыі Сычуань галоўныя сілы кітайскай чырвонай арміі, прайшоўшы правінцыю Хунань і Гуансі, прарвалі фронт нанкінскіх войск і 17 снежня ўступілі у Гуйчжоу, працяўжаючы прасоўвацца на Поўнач. Нанкінскія войскі,—піша карэспандэнт, —не аказваюць сур'ёзнага супраціўлення чырвонай арміі, таму «правінцыя Сычуань знаходзіцца зараз у небяспецы».

Песімізм у нанкінскіх ваенных колах

ТОКІО, 21 снежня. (БЕЛТА). Нанкінскі карэспандэнт агенцтва «Сімбун рэнга» піша, што дзеючая ў раёне Цзіндэ ў правінцыі Аньхой кітайская Чырвоная армія пад камандаваннем Ло Пін-гуя і Фэн І-міна налічвае 20.000 байцоў.

Нанкінскія ваенныя колы—піша далей карэспандэнт — песімістычна расцэньваюць становішча ў правінцыі Аньхой, бо «Чырвоная армія храбра адбівае ўсе атакі правінцыяльных войск, ў поспехі карнай экспедыцыі супроць Чырвонай арміі ў гэтым раёне мала верыць».

Уцякаюць пад прыкрыццё кананерак

НЬЮ-ЮРК, 20 снежня. (БЕЛТА). Як паведамляе «Нью-Юрк таймс» з Анхая, амерыканскія консульскія ўлады далі інструкцыю амерыканскім грамадзянам у правінцыі Аньхой неадкладна выехаць ва Уху, дзе знаходзяцца амерыканскія, англійскія і японскія кананеркі. Паведамляюць, што комуністычныя атрады пагражаюць многім гарадам правінцыі Аньхой.

***

ЛОНДАН, 20 снежня (БЕЛТА). Шанхайскі карэспандэнт «Таймс» паведамляе, што большасць місіянераў у раёнах на поўдзень ад Уху (правінцыя Аньхой) прыбыла ў Анхай. Тысячы войск, — піша карэспандэнт, — зараз прыбыл ў раён Уху для барацьбы з чырвонымі. Англійскія, амерыканскія і японскія кананеркі таксама стаяць у гэтым раёне.

БОЛЬШЭВІКІ МАСКВЫ І ЛЕНІНГРАДА АДНАДУШНА АДАБРАЮЦЬ РАШЭННІ ЛІСТАПАДАЎСКАГА ПЛЕНУМА ЦК ВКП(б)

МАСКВА, 22-XII. (БЕЛТА. 21 снежня па ўсіх раёнах Маскавы адбыліся сходы партыйнага актыву, прысвечаныя вынікам лістападаўскага пленума ЦК ВКП(б) і снежаньскага пленума МК і МГК ВКП(б).

З выключнай антыпасцю большэвікі сталіцы абмяркоўваюць гэтыя гістарычныя рашэнні, якія знамянуюць новыя гіганцкія перамогі краіны социялізма.

Даклады сакратароў райкомаў і спрэчкі па гэтых дакладах ускрывалі ступень падрыхтаванасці кожнага раёна да ажыццяўлення рашэнняў пленума Цэнтральнага Камітэта аб адмене картачак на хлеб і некаторыя іншыя прадукты. У прынятых рэзалюцыях масквоўскі партактыў цалкам і поўнасцю адабрае ўсе рашэнні лістападаўскага пленума ЦК і аб'яднанага пленума МК і МГК ВКП(б), расцэньваючы іх як сведчанне ўзрастаючай магутнасці нашай социялістычнай радзімы і трыумф мудрай палітыкі большэвіцкай партыі, натхняемай і кіруемай ленінскім ЦК і вялікім Сталіным.

Бурнае і ўсеагульнае абурэнне выклікала паведамленне аб раскрыцці «Ленінградскага цэнтра», ахвоцця былой зіноўеўскай апазіцыі, ахвярай якога паў С. М. Кіраў. Усе выступаўшыя з найвялікшым гневам і жгучай ненавісцю гаварылі аб падонках былой зіноўеўскай апазіцыі, пасмеўшых падняць здрадніцкую руку на партыю, на яе перадавых байцоў, і трэбавалі бязлітасной расправы з тройчы агіднымі здрадніками рабочага класа.

Гэтыя думкі знайшлі поўнае адлюстраванне ў рэзалюцыях сходаў партыйнага актыва чырвонай сталіцы.

У рэзалюцыі партактыва Сталінскага раёна гаворыцца: «Актыў трэбуе да канца вытруціць подлясць контрэвалюцыйных падонкаў зіноўеўскай антыпартыйнай групы. Вышэй сцяг большэвіцкай пільнасці і непрымірымасці к ворагам рэвалюцыі!»

Неўтрымны ўзрыў абурэння парушыў цішыню зала, калі сакратар ленінскага райкома т. Сойфер заговарыў аб здрадніцкім выстрале ў Смольным. У рэзалюцыі партактыву, аднадушна адабраючы рашэнні лістападаўскага пленума ЦК, пленума МК і МГК, ад імя ўсёй партыйнай арганізацыі раёна патрабуе бязлітаснай расправы з падонкамі былой зіноўеўскай групы, якая вырадзілася ў гнуснейшую тэрарыстычную банду.

— Ніколі і нікому не ўдасца пахіснуць жалезныя рады ленінскай партыі, якою кіруе геніяльны нахіліець перамог социялізма, вялікі СТАЛІН,—заявілі 1.500 большэвікоў Чырвонай Прэсні. Асабліва яркую прамову сказала работніца Трохгоркі т. Куроч: «Адмена картачак,—сказала яна,—гэта аднака нашай сілы. Гэта значыць, што мы маем многа хлеба, не таго кулацкага хлеба, які нам прапаноўвалі правыя апартуністы, а хлеба социялістычнага, калгаснага. Сталін—наш любімы правадыр—яго ў вядзе нас па правільнаму шляху, указанаму Леніным. Подлы выстрал у Кірава не спыніць пераможнага шэсця социялізма».

У аднадушнае прыняцце рэзалюцыі партыйны актыў Чырвонай Прэсні заяўляе аб сваёй бязмежнай адданасці справе партыі, справе Леніна-Сталіна. Рашэнні пленума з'яўляюцца для краснапрэсненскай арганізацыі праграмай баявых дзеянняў. Большэвікі раёна з найглыбейшым абурэннем ганьбуюць падонкі зіноўеўскай антысовецкай групы, якая дакацілася да забойства правадыра ленінградскіх большэвікоў.

Партыйны актыў Кіраўскага раёна заяўляе: «Большэвікі і пролетарыі Кіраўскага раёна ў адказ на выпадку гнусных агентаў класавага ворага, подласць падонкаў былой зіноўеўскай антыпартыйнай групы, вырваўшай з нашых радоў С. М. Кірава, яшчэ цясней згуртуюць свае рады вакол партыі, да ЦК і нашага вялікага Сталіна, узмоцняць рэвалюцыйную пільнасць і бязлітасна будуць распраўляцца з класавым ворагам і яго агентурай».

— Няма і не можа быць пітасці перараджэнцам, здрадніцкім радзімы, падонкам былой зіноўеўскай апазіцыі, — гэта думка выказваецца ў выступленнях на партактыве Окцябрскага раёна. Кожнае выступленне выражала несамрушальную згуртаванасць партыі, жалезную волю большэвіцкай партыі да яе далейшай барацьбы за социялізм.

Тысячны сход большэвікоў Фрунзенскага раёна ў адзагалосна прыняцтай рэзалюцыі заявляе, што рашэнні пленума ЦК і ўказанні пленума МК і МГК павінны з'явіцца баявой праграмай для ўсіх партыйных арганізацый раёна на бліжэйшы здрэзвы час. Ад кожнага комуніста зараз патрабуецца яшчэ большае павышэнне пільнасці, ідэйна узброенасці і большэвіцкай валуічасці, умеў ня распазнаваць ворага ў сякім зародку і бязлітасна выкрываць і разбіваць яго.

На ўсіх сходах масквоўскага партактыва пад бурныя авацыі прымаліся прывітанні тав. Сталіну і тав. Кагановічу.

***

ЛЕНІНГРАД. 22 XII (БЕЛТА). Учора на прадпрыемствах Ленінграда прайшлі партыйныя сходы, на якіх абмяркоўваліся рашэнні лістападаўскага пленума ЦК ВКП(б) і снежаньскага пленума ленінградскага абкома і гаркома ВКП(б).

Партыйны сход Кіраўскага завода (б. «Красный Путиловец») патрабуе: «Няхай пітасці ворагу! мы патрабуем самай суровай расправы з усімі, хто асмеляецца падняць руку на пролетарскую дыктатуру, на правадыроў рабочага класа».

Партарганізацыі цэхаў Балтыйскага завода ў рэзалюцыях заявляюць: «Мы патрабуем знішчыць падонкі былой зіноўеўскай антыпартыйнай групы — банду фашысцкіх агентаў. Мы пічым неабходным узяць пад асобы кантроль тых, хто знаходзіўся у зіноўеўскай апазіцыі».

На сходзе большэвікоў завода «Электросила» стары работнік вытворчасці т. Дзевід сказаў: «Я ўспамінаю, як арудавалі зіноўеўцы на нашым заводзе. А калі прыехаў у Ленінград Сергей Міроновіч Кіраў, іх песенька была спета. Вось за гэта і не ўзлюбілі нашага любімага Міроныча Зіноўеў і яго падонкі».

Забойства Кірава гаворыць нам аб тым, што вораг прытаіўся, што вы радзіўшыяся ў фашысцкую эпоху зіноўеўцы гатовы пры першай магчымасці нанесці ўдар партыі. Але калі ім не ўдалося пахіснуць нас 10 год назад, то зараз ім і мараць не прыходзіцца аб якім набудзь поспеху. Роспач і безнадзейнасць штырхаюць гэтых агацетных ворагаў рабочага класа на шлях індывідуальнага тэрора.

Электрасілаўцы поўнасцю адобрылі рашэнні лістападаўскага пленума ЦК ВКП(б) і ўзялі на сябе жалезныя абавязацельствы ў сувязі з прысваеннем заводу імя С. М. Кірава. Рабочыя патрабуюць бязлітаснай кары подлым забойцам правадыра ленінградскіх большэвікоў.

— Няхай ворагі не разлічваюць на тое, што подлае і гнуснае забойства т. Кірава ўнясе замяшанне ў нашы рады,—заявілі комуністы завода «Электрык» у прынятай рэзалюцыі.

Сход комуністаў завода «Электрык» патрабуе ад органаў пролетарскай дыктатуры бязлітаснага знішчэння контрэвалюцыйных падонкаў былой зіноўеўскай апазіцыі.

АБ ПЕРАЙМЕНАВАННЯХ ДЛЯ УВЕКАВЕЧАННЯ ПАМЯЦІ тав. С. М. КІРАВА

ПАСТАНОВА ПРЭЗІДЫУМА ЦЭНТРАЛЬНАГА ВЫКАНАЎЧАГА КАМІТЭТА БССР

Прэзідыум Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта БССР ПАСТАНАЎЛЯЕ:

1. Задаволіць хадайніцтва менскіх арганізацый і пераймеаваць:

а) варштата-будаўнічы завод «Комунар» у варштата-будаўнічы завод «Комунар» імя С. М. Кірава;

б) Комуністычны інстытут журналістыкі БССР у Комуністычны інстытут журналістыкі БССР імя С. М. Кірава;

в) 4-ю ўзорную менскую сярэднюю школу ў 4-ю ўзорную школу імя С. М. Кірава;

г) стадыён «Дынамо» ў стадыён «Дынамо» імя С. М. Кірава;

д) Універсітэцкую вуліцу ў вуліцу Кірава.

2. Задаволіць хадайніцтва гомельскіх арганізацый і пераймеаваць:

а) машына-будаўнічы завод «Пролетарый» у машына будаўнічы завод імя С. М. Кірава;

б) пясны інстытут у пясны інстытут імя С. М. Кірава.

3. Задаволіць хадайніцтва віцебскіх арганізацый і пераймеаваць:

а) завод «Чырвоны металіст» у завод «Чырвоны металіст» імя С. М. Кірава;

б) Педагагічны інстытут у педагагічны інстытут імя С. М. Кірава;

в) Вокзальную вуліцу ў вуліцу Кірава.

4. Задаволіць хадайніцтва барысаўскіх арганізацый і пераймеаваць запалкавую фабрыку «Пролетарская перамога» ў запалкавую фабрыку «Пролетарская перамога» імя С. М. Кірава.

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта БССР А. ЧАРВЯКОЎ.
Сакратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта БССР М. ЛЯЎКОЎ.
21 снежня 1934 г.
г. Менск.

БАБРУЙСКАЯ ПРАМЫСЛОВАСЦЬ ВЫКАНАЛА ГАДАВЫ ПЛАН

ЦК КП(б)Б—тт. ГІКАЛО, ВАЛКОВІЧУ,
СНК БССР — тав. ГАЛАДЗЕДУ,
ЦСПСБ — тав. КАБАЛЬЧУКУ,
Рэдакцыям газет «ЗВЯЗДА», «РАБОЧЫ»

Промфінплан 1934 года дзяржаўнай, мясцовай і саматужнай прамысловасцю па Бабруйскаму раёну выканан 20 снежня і на 100,9 проц. у тым ліку дзяржаўнай прамысловасцю—на 101,4 проц. Мабілізуем рабочых на выкананне ўзятага на сябе павышанага выпуску прадукцыі ў фонд з'езда совецтаў у суме 4 мільёны руб.

Райком КП(б)Б МІЛЛЕР,
РВК ЦАРОНАК,
Райпрофсовет БЛЮМКІН.

ПРАМЫСЛОВАСЦЬ РЭЧЫЦЫ ВЫКАНАЛА ГАДАВЫ ПРОМФІНПЛАН

ЦК КП(б)Б—т.т. ГІКАЛО, ВАЛКОВІЧУ
СНК БССР — тав. ГАЛАДЗЕДУ
РЭДАКЦЫЯМ ГАЗЕТ «ЗВЯЗДА» І «РАБОЧЫ».

Ажыццяўляючы рашэнні XVII з'езда ВКП(б) і ўказанні таварыша СТАЛІНА, пад непасрэдным кіраўніцтвам ЦК КП(б)Б на чале з т. ГІКАЛО, прамысловасць Рэчыцкага раёна 21 снежня выканала промфінплан 1934 г. на 100,15 проц. Выпушчана прадукцыі ў нязменных цэнах 1926-1927 г. на 21.036.600 руб.

Шырока разгортваючы социялістычныя метады працы, перадавыя прадпрыемствы раёна — запаляная фабрыка «X Окцябр», дубільна-экстрактны завод імя Варашылава, лесапрамгас, заваявалі ўсесаюзнае першынства па конкурсу і атрымалі пераходныя сцягі ЦК саюзаў і трэстаў.

Партарганізацыя і рабочыя-ўдарнікі, інжынерна-тэхнічныя работнікі Рэчыцкага раёна ў сувязі з вытворчым паходам імя VII з'езда совецтаў разгарнулі ўдарную падрыхтоўку да новага гаспадарчага года з тым, каб забяспечыць у 1935 годзе поўнае выкананне промфінплана па колькасных і якасных паказальніках усімі прадпрыемствамі раёна.

Сакратар райкома КП(б)Б МАЛІНІН.
Старшыня райвыканкома САЎКОЎ.
Старшыня райпрофсовета ЭЛЬПЕРЫН.

ПЛАН ІЛЬНОЗАГАТОВАК ВЫКАНАН НА 92,5 ПРОЦ.

Чацвертая пяцідзёўка снежня не дала жаданага зруху ў ільнозагатоўках. План ільнозагатовак па БССР на 20 снежня выканан на 92,5 проц. Прырост за 5 дзён склаў ўсяго 0,9 проц. Па ранейшаму ганебна цягнуцца ў хвосце аснаўныя ільнагодныя раёны — Гарадоцкі (87,3 проц.), Горацкі (90,1 проц.), Дубровенскі (69,8 проц.), Мсціслаўскі (71,4 проц.), Расонскі (88,4 проц.), Чавускі (78,5 проц.), Быхаўскі (84,5 проц.), Карматынскі (74,8 проц.).

Толькі 37 раёнаў поўнасцю выканалі план ільнозагатовак.

ВЫКАНАННЕ ПЛАНА ІЛЬНОЗАГАТОВАК З'ЯУЛЯЕЦЦА ЗАРАЗ ГАЛОУНАЙ ГАСПАДАРЧА-ПАЛІТЫЧНАЙ ЗАДАЧАЙ КОЖНАГА РАЕНА, СЕЛЬСОВЕТА, КАЛГАСА

ТАМ, ДЗЕ ЛЁН РАЗАБРАН, ЯГО ТРЭБА САБРАЦЬ І ЗДАЦЬ ДЗЯРЖАВЕ.

ТРЭБА ЦВЕРДА І ЧОТКА РАСТЛУМАЧЫЦЬ КОЖНАМУ НОВАМУ КАЛГАСНІКУ, ЯКІ ЎХІЛЯЕЦЦА АД ВЫКАНАННЯ ПЛАНА ІЛЬНОЗАГАТОВАК, ШТО НІ ДЗЯРЖАВА, НІ КАЛГАС НЕ ДАПУСЦЯЦЬ ГЭТАГА ЎХІЛЕННЯ АД АБАВЯЗАЦЕЛЬСТВАЎ ПЕРАД ДЗЯРЖАВАЙ. ТРЭБА РАШУЧА ЎЖЫЦЬ СОВЕЦКІЯ ЗАКОНЫ СУПРОЦЬ САБАТАЖНІКАЎ ІЛЬНОЗАГАТОВАК, ПЕРШ ЗА ЎСЕ ТЫХ АДНААСОБНІКАЎ, ЯКІЯ З ГОДА Ў ГОД ЗРЫВАЮЦЬ ІЛЬНОЗАГАТОЎКІ.

ЛІБЕРАЛЬНІЧАЮЦЬ З РАСКРАДВАЛЬНІКАМІ ІЛЬНУ

Исцілаўскі раён ужо шостую кампаніёўку знаходзіцца на чорнай дошцы. Да гэтага тут ужо прызвычаіліся. Раённае кіраўніцтва замест сапраўднай большэвіцкай барацьбы за лён больш займаецца пасяджаннямі і нарадамі. А ў калгасах тымчасам ідзе масавае раскрадванне ільну. У калгасе «Сталінскі прыліў», Татаршчынскага сельсовета ў брыгадзе Майсеева раскралі ўсю трасту. На ўсяму калгасу раскрадзена 10 пудоў пянькі. Нядаўна старшыня калгаса зрабіў вобыск і выявіў пакрадзеную трасту. Старшыня склаў акт, і на гэтым справа скончылася. Раскрадальнікі калгаснай маемасці асталіся непакаранымі.

Калгас імя Гея, Мазалаўскага сельсовета, план здачы трасты выканаў на 63 проц., а валакна на 31 проц. Пераважную частку ільнопрадукцыі тут таксама раскралі. Факты пакражы выяўлены і ў калгасе «Социялістычнае земляробства», Пячонкаўскага сельсовета. Раённыя арганізацыі і пракуратура зусім не вядуць ніякай барацьбы з раскрадальнікамі ільну.

МЯЦЕЛІЦА.

СПЕКУЛЯНТЫ НЕ АТРЫМЛІВАЮЦЬ АДПОРУ

У агульным плане ільнозагатовак па Брагінскаму раёну аднаасобнікі займаюць 40 проц. Не гледзячы на гэта як сельсоветы, так і раённыя арганізацыі ўвесь час недаацэньваюць аднаасобны сектар. Гэта значна адбілася на тэмпах ільнозагатовак і з'яўляецца адной з прычын таго, што Брагінскі раён злачынна зацягнуў апрацоўку і здачу ільну. Бяздзейнасць раённых арганізацый скарыстоўваюць яўныя сабатажнікі і кулацкія агенты. У вёсцы Катлавіцы, Малейкаўскага сельсовета, з 19 аднаасобных гаспадарак 10 зусім не прыступалі да здачы ільну. У вёсцы Нудзічы аднаасобнік Халько Іван некалькі раз заяўляў, што ў яго няма ільну. Халько падтрымлівалі і члены сельсовета. Калі-ж нядаўна праверылі, то аказалася, што Халько мае 38 кгр. ільну—у два разы больш таго, што ён павінен здаць па кантрактацыйнаму дагавору. У апошнія дні ў раёне пачалася спекуляцыя ільном. Лён перапрадаюць па спекуляцыйных цэнах як калгасы, так і аднаасобнікі. Мясцовыя арганізацыі не вядуць барацьбы з сабатажнікамі і спекулянтамі ільном.

РЭМСКІ і ЗАГОРСКІ.

З СЕЛЬСОВЕТАЎ, КАЛГАСАЎ, ІЛЬНОЗАВОДАЎ

◆ В.-Хальнявіцкі сельсовет, Крупскага раёна, увесь час зрываў ільнозагатоўкі, не гледзячы на тое, што эканамічна ён даволі моцны, і лён уредзіўся не дрэнны. Прычынай гэтага з'яўлялася тое, што ў калгасы сельсовета прабраліся кулацкія агенты, якія ўтойвалі лён. Новы склад сельсовета на чале з тав. КАРАЛЁВЫМ выкрыў кулацкія манеўры.

Старшыня калгаса «Іскра» увесь час кляўся, што ільну ў калгасе няма. У сапраўднасці-ж лён у гэтым калгасе раскралі і ўтаілі кулакі. Макрыцкі ад гэтым ведаў. Толькі зараз пры дапамозе актыва ўтоены лён знойдзен і здан дзяржаве. Выяўлен утоены лён і ў калгасе «Чырвоная зорка» (старшыня Калгаса Галавач). Раскрадальнікі калгаснай маемасці павінны быць сурова пакараны.

Селькор КАЖАМЯКІН.

◆ Калгас імя Будзённага, Крыўскага сельсовета, Уваравіцкага раёна, дагэтуль не закончыў апрацоўку і здачу ільноваппакна.

Праўленне калгаса на чале з старшынёй Ларывонавым ігнаруе пастанову ЦК і СНК аб стымуляванні калгаснікаў, якія працуюць на ільне. Хлеб, атрыманы за лён, тут разбазарваюць, падсяляюць паміж усімі калгаснікамі. У выніку не апрацоўку ільну выходзяць толькі некалькі калгаснікі.

◆ Калгас «Жэрднае» (старшыня Стаян), Брагінскага раёна, злачынна зацягвае ільнозагатоўкі. Апрацоўку ільну тут вялі і вялі па-шкодніцку. Пераважная частка ільну ідзе ў здыход. Нямала ільну пакраў кладаўшчык.

БОЛЬШ ПАЛЯЦЬ, ЧЫМ АПРАЦОУВАЮЦЬ

Лельчыцкі раён за зрыў ільнозагатовак на працяту раду дэкад знаходзіцца на чорнай дошцы. На 15 снежня план ільнозагатовак выканан ледзь на 83 проц. У апошнія дні паступленне ільну амаль зусім спынілася. Прыёмны пункт больш знаходзіцца на замку.

Галоўнай прычынай зрыву ільнозагатовак з'яўляецца тое, што раённае кіраўніцтва гэтай справай зусім не кіруе. Апрацоўка ільну ў большасці калгасаў нізкаякасная. Лён сушаць у ямах і больш паляць яго, чым апрацоўваюць. Калгасы «Чырвоная ляда», «Новая ніва», «III Інтэрнацыянал» з добрай трасты здаюць валакно не вышэй 4-га нумара. У многіх калгасах лён раздалі сушыць калгаснікам па хатах. Напрыклад, у калгасах «Пагранахрана», «Першамайск», «Парыжская комуна», дзе трасту раздалі для сушкі калгаснікам, зараз не хапае ільну, бо значная частка яго раскрадзена.

СКУРАТ.



Хто не ведае ў калгасе «Ленінталь», Азова-Чорнаморскага краю свайго папшага ўдарніка Отто Готмана? З работай спраўляецца добра. Ён у гэтым годзе выпрацаваў 300 працадзён. Лішкі хлеба прадаў калгасу. На выручаныя грошы купіў сабе добрую вопратку, абутак і др. рэчы. Сястры Наталі купіў гітару і навучыў яе граць. Калгаснікі ў свабодны час ад работы прыходзяць слухаць яго ігру на скрыпцы. НА ЗДЫМКУ: Наталья і Отто Готман развучваюць новую песню.

М. КЛІМКОВІЧ

З ЗАЛЫ З'ЕЗДА СОВЕТАЎ КРЫЧАЎШЧЫНЫ

Яна выйшла на трыбуну крычаўскага з'езда советаў і проста, зусім проста пачала расказваць пра перамогі свайго торфазавода «Калектыўная праца». Звычайная вясковая дзяўчына Паша Бялёва, у вялікай з вялікімі кветкамі хустцы, у новым паліце, уважліва ўглядаючыся ў прыціхшую залу, удумліва, разважліва расказвае пра сушку торфу, пра процанты выканання промфінплана, пра запасныя часткі, якіх не хапае.

— Мала нам дапамагаў РВК: горсовет ні адной падводы за чацверты квартал на торф не паслаў, іншыя советы толькі 30 проц. сваёй нормы вывезлі, а РВК маўчыць, быццам не яго справа, што цэментны завод застаецца без апалу.

І не толькі ў прамове комсамолкі Пашы Бялёвай, але ў прамове калгаснікаў Міхнінавай Дуні, якая закончыла прамову пажаданнем, «каб былі калгасы на ўсім свеце і на ўсе 100, можна сказаць»,—і ў прамове комсамольца-трактарыста, які з вялікім абурэннем гаварыў пра члена сельсовета, парушаючага законы,—калі комсамолец прышоў да яго ў якасці брыгадзіра, той смаліў свінню,—і ва ўсіх прамовах далегатаў адчуваецца, што спаўшая тысячагоддзе вёска раскатурхалася, агледзелася і рушыла ў велізарнейшы небывалы паход. Прамовы, у большасці, канкрэтныя, як і тая справа, пра якую яны гаварылі, сведчылі пра тое, што вёска, разбуджаная калектывізацыяй, прайшла першы этап свайго новага шляху і ўзышла на другі, на якім яна пачынае пажынаць плады сваёй перабудовы.

— Мы апрымалі на працадзень у 2,5, у 3 разы больш, чым у мінулым годзе—заяўлялі шматлікія делегацыі з калгасаў, прысланыя з рапартамі з'езду советаў. Гэты сказ аб важкасці прападня стаяў заўсёды пасля пераліку 100-процантнага выканання дзяржаўных абавязкаў па хлебу, ільну, па продажу хлеба дзяржаве, пасля пераліку на 100 проц. выкананых сельскагаспадарчых работ і агракультурных мерапрыемстваў. І ні адзін рапарт не абыходзіўся без патрабавання культуры, пачынаючы ад чыстаты ў хаце і канчаючы мастацкай літаратурай.

Да рэчы, на мастацкую літаратуру небывалы попыт.

Велізарная цяга да культуры, прычым ёю ахоплены сапраўды мільённыя масы—вось што характэрна зараз для вёскі, і ў аўладанні гэтай культурай мы робім сапраўды сімімільныя крокі. Не ведаеш сам чаму дзівіцца—ці гордаму цэментнаму заводу, раскінуўшаму гігантыкарпусы на цэлы кілометр, ці крычаўскай калгаснай хакейнай камандзе? І тое і другое было-б казачным і нязбыўным толькі 17 год назад.

— Вучыцца хачу, не ведаю як, здаецца, усё-б аддала, у адной-бы кашулі ў свет пашла, каб толькі вучыцца.—Гэтыя словы Пашы Бялёвай былі прасякнуты вялікай прагнасцю да культуры і вялікім, нязломным жаданнем і воляй ёю аўладаць.

Слухаючы Пашу Бялёву, мне міма волі думалася:

«У нас няма ў літаратуры вобраза дзяўчыны-комсамолкі. А між тым, каб любы пісьменнік (з «актыва») узяў гэту дзяўчыну («Пашу Грыгор'еўну») (як яна адрэкамендавалася мне) і арабіў больш-менш удалы «фстаздымак» з яе і яе работы, — ужо быў-бы вобраз, які стаяў-бы вышэй за ўсё напісанае да гэтага часу. Калі-ж дадаць да гэтага фотаздымка крыху творчай фантазіі, даць рамку з гэтай фантазіі, — атрымаецца яркі незабыўны вобраз.

Свой расказ Паша скончыла ўсё той-жа думкай пра вучобу.

Вобраз т. Бялёвай — гэта вобраз новага чалавека нашай краіны, вобраз маляўнічы, поўнакроўны, валявы, і яму варта з'явіцца ў мастацкай літаратуры.

Адно адступленне: нашым пісьменькам трэба прыслухоўвацца да мовы шырокіх народных мас, у тым ліку да мовы новага пакалення — тады іх уласная мова не будзе такой худасочнай. А работнікам нашага совецкага апарата трэба і больш прыслухоўвацца да мовы мас і больш чытаць літаратуру, тады мова гэтых работнікаў не будзе стаяць у такой крыклівай супярэчнасці з мовай тых мас, перад якімі ім, работнікам, прыходзіцца выступаць.

Я запісаў дасловна прамову раённага жывёлавода тав. Банчыкава. Яна складаецца з такіх фраз «Я паставіў пытанне ў тым напрамку, што XVII з'езд ВКП(б) паставіў пытанне пра пытанне племенізацыі раёна... Класавы вораг сытрэў справу в нажом і парэзаў маладняк, а мы на сённешні дзень і ва ўмовах абвостранай класавай барацьбы не аддалі гэтай справе належнай увагі і з барбой не спраўляліся... Я ставіў пытанне аб тым, што калгасы дыскрэдытуюць дырэктывы РВК і рэжуць коні, якія не прыстасаваны да скуры, замест тых, якія прыстасаваны».

Сабатаж, укамплектаванне, інфармацыя, племінізацыя, інкараванне, місія, рэсурсы, рэйд, рэгламентацыя, абартызацыя, дыскрэдытацыя, палеміка і сотні іншых замежных слоў зусім невядомых сялянскай масе, сыпаліся на галовы далегатаў ды яшчэ ў такіх спалучэннях, што тут і добра граматны чалавек галаву зломіць.

Пара «паставіць пытанне» аб аўладанні беларускай мовай нашым актывам і «навесці рашучую барацьбу» супроць арганізавання яе Банчыкавымі на свой манер.

Пакуль Банчыкавы «ставяць пытанні пра развядзенне такога віду жывёлы, як птушкі», — кулакіня агенты душаць жарабят яшчэ ў зэрэвах кабыл: па раёну пракаціліся масавыя аборты кабыліц. Я падкрэсліваю масавыя. Раённыя арганізацыі аддалі пад суд 2-3 конюхаў і на гэтым супакоіліся, не зразумеўшы, што масавасць абортаў сігналізуе аб велізарнейшай небяспецы на гэтым важнейшым участку жывёлагадоўлі. Неабходнасць работы кулака, сляпы арганізаваны работы павінны выклікаць вялікую трывогу ў нашых апаратах. У першую чаргу такую трывогу павінны забіць нашы органы. Мы абавязаны выкрыць ворага і знішчыць яго.

З'езд правільна сігналізаваў пра небяспеку ў выкананні планаў жывёлагадоўлі: многія калгасы не гатовы да прыёму маладняка, яны не маюць нават ацепленых хлявоў у якіх «нованароджаных» можна-б захаваць ад марозаў. Наогул справа з хлявамі для апрамаджанага стала ў Крычаўшчыне—дрэнная, як дрэнная справа і з іншымі будынкамі апрама джанай гаспадаркі. Крычаўцы не скарысталі вопыта іншых раёнаў у пабудове калгасных гумнаў, свіраў, ферм, двароў: усё гэта раскідана і знаходзіцца ў карлікавых, былых аднаасобных будынках. З'езд даў дырэктыву фарсіраваць апрамаджанае будаўніцтва. «Гаспадар раёна», як называлі з'езд калгаснікі, і гаспешні выносіў гаспадарскія, і крытыкаваў работу раённых арганізацый па-гаспадарску. Мопна «ўсыпалі» далегаты чыгункі і цэментнага завода РВК і горсовету за «паласу адчужэння», якой адгаражаліся раённыя арганізацыі ад патрэб рабочых гэтых двух буйнейшых рабочых цэнтраў раёна.

***

Крычаўскі раён — ВОСР у мініятуры. Шэсць-сем год таму назад уся прамысловасць яго складалася з кіно, лазні і лесапільні на 1 раму. Зараз у раёне адзін з «518», буйнейшы цэментны завод, Крычаўскі раён —тыповы сельскагаспадарчы раён — раптам атрымаў групу заводаў рэспубліканскага і ўсесаюзнага значэння на якіх працуюць зараз 3.000 рабочых. Сярод іх значная група высокакваліфікаваных.

Раён становіцца калгасна-індустрыяльным. На жаль, раён не змог ліквідаваць разрыў паміж атрыманай перадавой тэхнікай (заводамі) і культурнымі сваімі багацтвамі. Крычаў застаўся звычайнай вялікай вёскай з брудными, нават балотнымі вуліцамі, маленькімі сялянскімі хатамі, з штотыднёвымі пажарамі. Маючы пад бокам магутную ЦЭС цэментнага завода, горад не мае электрычнага асвятлення — не хапае 5 кілометраў дроту, каб злучыцца з ЦЭС.

ЦВК і СНК БССР павінны дапамагчы Крычаву падраўняцца па цэментнаму заводу.

У КЛААЦЫ КОНТРРЭВОЛЮЦЫІ *)

КАРЛ РАДЭК

Партыя сарвала з усіх апазіцый маскі, партыя разбіла іх ідэйна, партыя выкінула іх з радоў работнічага класа, давёўшы іх да стану крупачак, за якімі не стаялі ніякія пласты рабочых. Карта ўсіх гэтых апазіцый была біта канчаткова ў першыя гады пяцігодкі. Усё, што было жывога, энергічнага, веруючага ў сілы свае, у сілы пролетарыята, з натхненнем аб'ядналася вакол ленінскага Цэнтральнага Камітэта і зразумела, што партыя, кіруемая Сталіным, вядзе соціялізм да перамогі. Разбітыя групы апазіцыянераў распаліся, распаўзліся па шчэлях. Тыя элементы ў іх, якія прадстаўлялі сабой часова абіўшыхся з шляху пролетарскіх рэвалюцыянераў, вярнуліся ў партыю, каб шчыра сваімі справамі выправіць свае палітычныя памылкі, якія перарасталі ў злачынствы супроць пролетарскай дзяржавы, супроць пролетарскай дзяржавы, супроць інтарэсаў міжнароднага соціялізма.

Незначная колькасць асталася адкрыта па-за партыяй, упорствуючы ў памылках і перараджаючыся з кожным днём усё больш у контрэвалюцыйныя групкі, стаўшы перадавым атрадам контрэвалюцыйнай буржуазіі. Частка-ж пашла ў партыю не таму, што пераканалася ў сваёй неправаце, а таму, што была разбіта, пашла ў партыю, каб адсядзецца, пашла ў партыю, трымаючы камень за пазухай. Гэта частка прабавала ў моманты неабходнасці адкупіцца заявамі, прысягамі, але даволі было паглядзець на твары гэтых нявочых людзей, каб зразумець што, нічога не маючы за душою, не маючы ніякай палітычнай праграмы, яны асталіся генераламі, страціўшымі армію, але не страціўшымі сумявання па пагонах. І гэта асяроддзе бясчэсных палітычных шарлатанаў, людзей, які ў што не верачых, апрача свайго «вялікага гістарычнага значэння», гэта асяроддзе стала элементам разлажэння ў адносінах да сваіх унцер-афіцэраў і сваіх радавых. Гэта асяроддзе не мела ніякага ўплыву ў партыі. Партыя судзіла аб вярнуўшыхся апазіцыянерах, якія чесна хацелі працаваць, па іх справах і той старанасці, з якою яны дапамагалі будаваць соцыялізм, па той жыццёраднасці, з якой яны зліваліся са змагаючайся рабочай масай, каб перамагчы ўсе затрудненні. Двурушнікам партыя не верыла. Але іх двурушніцтва гаварыла ніжэйшым паверхам былой апазіцыі: не разабройвайцеся, мы, вашы правадыры, прымушаны манеўраваць, але баі яшчэ ўперадзе. Але нельга захаваць ніякія кадры, як-бы яны ні былі малы, не разгортваючы перад імі перспектывы, апіраючайся на рэальныя фактары, на сапраўднае развіццё. А што маглі зіноўеўскія двурушнікі паказаць моладзі, яшчэ з імі звязаным групкам, што яны маглі процідаставіць вялікім перамогам пяцігодкі? У іх не было нічога за душой, яны ніякай рэальнай перспектывы не мелі і ніякай рэальнай перспектывы прадставіць не маглі. Таму ім прыходзілася перажэлічваць усякія затрудненні, выхоўваць сваіх людзей у духу паражэнства, вучыць іх подлай справе спадзявацца на паражэнне рабочага класа, на паражэнне комуністычнай партыі. Каб гэта рабіць, трэба было будзіць недавер'е і нянавісць к лепшым людзям нашага класа, к лепшым людзям нашай партыі. Усё гэта прадстаўляла такую ідэйную чартоўшчыну, ставала такія ўнутраныя канфлікты, рыла такія ўнутраныя канфлікты, што ў іх людзі трацілі чэсць і вяру, людзі станавіліся здраднікамі пролетарыята, партыі, рэвалюцыі, людзі апускаліся на дно. Многія апускаліся на дно і ў бытавым сэнсе раней, чым канчаткова ішлі на дно палітычна. Для таго, каб выпусціць кулю з рэвальвера, патрэбна шчапотка пораху, але для таго, каб людзі, калісці меўшыя справу з рабочым рухам, людзі, калісці чытаўшыя Леніна і Маркса, маглі накіраваць рэвальвер на кіраўніка совецкай улады і пралетаўніка нашай партыі, для гэтага патрэбны нечуванае сіла падзення і нечуванае азвярэнне, якія развіліся ў тых, што апынуліся на дне.

Непасрэдную соцыяльную сілу гэтай групы вельмі добра акрэслілі рэзалюцыі ленінградскага і маскоўскага абкомаў, гаворачы аб ёй, як аб падонках. За ёю няма ніякіх пластоў рабочых, сялян, тыя чэсныя ленінградскія рабочыя, якія ў сілу старой сувязі пашлі часова за Зіноўевым, даўно працуюць з энтузіязмам над пабудовай соцыялізма пад кіраўніцтвам Сталіна. Група падонкаў прадстаўляе зажыва згніўшых рэнегатаў партыі, якія, узяўшы рэвальвер у рукі, сталі забойцамі правадыра пролетарыята і інтарэсаў буржуазіі. Яны небяспечны, калі іх не выкінуць з нашага будынка: яны могуць, прыкрыўшыся партбілетам, рабіць такія злачынствы, як забойства Кірава. Пазаз партыяй яны ідуць у клаку, дзе збіраюцца ўсе астаткі разбітых нашых класавых ворагаў. Партыя раздавіць іх, знішчыць, змяце з зямлі пры пераконаным падтрымманні ўсякага, каму дорага справа рабочага класа.

Фашысцкі друк будзе пітаць гэтых арганізатараў забойстваў, ён доказ таго, што непераможную ленінскую партыю быццам-бы подточае чэрвяк знутры. Пары падпальшчыкі вайны вельмі гэтага хацелі-б, але яны ўжо многага хацелі і ім вельмі часта ўжо прыходзілася расчароўвацца. Яны яшчэ раз расчаруюцца. Падонкі былой антыпартыйнай групы Зіноўева, гэта — мразь, узніклая з разлажэння ад паўных часціц нашай партыі, за гэты час грандыёзна вырасшай, поўнай жыццёвых сокаў і здароўя. Гэтыя падонкі — гэта агаўцелы вораг рабочага класа, якія апошнімі канчымі шляхам зноў прабраўшыся ў партыю і прыкрываючыся партбілетам, з'яўляліся агентамі класавага ворага, шпіёнамі і казутчыкамі злейшых ворагаў партыі і пролетарыята. Гэту мразь партыя раздавіць бязлітасна і пойдзе далей, вырашаючы з кожным днём усё больш буйныя задачы. Шагаючы па шырокай гістарычнай дарозе да знішчэння астаткаў класаў, да бясклассавага грамадства, спраўляючыся ў бай з усімі затрудненнямі, змагаючыся з галечай, змагаючыся за заможнае жыццё народных мас, стварыўшы ўпершыню асновы для сапраўднага чалавечага існавання, партыя наша з'яўляецца несакрушальнай сілай, а цяжкая ўтрата, якую нанеслі ёй падонкі былой зіноўеўскай антыпартыйнай групы, будзе толькі сігналам для ўзмоцненай пільнасці, для ўмацавання салідарнасці партыі ў барацьбе з усімі класавымі ворагамі.

*) З артыкула ў «Известиях» ад 21 снежня 1934 г.

В. БЫСТРАНСКІ

АД АПАЗІЦЫІ—К ТЭРОРУ

Перамогі пяцігодкі канчаткова дэмаралізавалі і разбілі ўшчэнт усе і ўсякія антыленінскія групоўкі.

Трэба прызнаць, што партыя згуртавана цэлер у адно як ніколі раней, — так гаварыў тав. Сталін на XVII з'ездзе ВКП(б). І далей ён падкрэсліваў:

«Ці значыць гэта, аднак, што барацьба скончана і далейшае наступленне соцыялізма адпадае, як лішняя рэч?

Не, не значыць.

Ці значыць гэта, што ў нас усё абстаіць у партыі добра, ніякіх ухілаў не будзе ў ёй больш і — стала быць— можна цэлер пачыць на лаўрах?

Не, не значыць».

Яшчэ на студзеньскім пленуме ЦК і ЦКК 1933 года тав. Сталін напомніў, што «рост магутнасці совецкай дзяржавы будзе ўзмацняць супраціўленне апошніх астаткаў паміраючых класаў. Іменна таму, што яны ўміраюць і дажываюць апошнія дні, яны будуць пераходзіць ад адных форм наскокаў да іншых, больш рэзкіх форм наскокаў, апелюючы да адсталых слаёў насельніцтва і мабілізуючы іх супроць совецкай улады. Няма такой пакасці і паклепу, ягую-б гэтыя былыя людзі не ўзялі на совецкую ўладу і вакол якіх не папрабавалі-б мабілізаваць адсталыя элементы. На гэтай глебе могуць ажыць і заварушыцца разбітыя групы старых контрэвалюцыйных партый эсэраў, меншавікоў, буржуазных нацыяналістаў цэнтру і акраін, могуць ажыць і заварушыцца асколкі контрэвалюцыйных апазіцыйных элементаў з трацкістаў і правых ухілістаў. Гэта, зразумела, не страшна. Але ўсё гэта трэба мець на ўвазе, калі мы хочам пакончыць з гэтымі элементамі хутка і без асаблівых ахвяр».

Словы таварыша Сталіна аказаліся прарочымі. Сапраўды, класавы вораг не дабіт да канца не знішчожана да канца і яго агентура ўнутры партыі. Аб гэтым сведчыць злачынны стрэл 1 снежня ў Смольным у слаўнага правадыра рабочага класа, правадыра ленінградскага пролетарыята тав. Кірава. Як сказаў тав. Молатаў у сваёй прамове на Краснай плошчы 6 снежня, «ворагі рабочага класа стралялі нам у грудзі — яны імкнуліся нанесці ўдар як можна бліжэй к сэрцу партыі». Яны цэліліся ў слаўны ленінска-сталінскі штаб нашай партыі, у яе выпрабаванае кіраўніцтва, якому наша краіна абавязана сваімі гігантскімі поспехамі за апошнія гады.

З подлых падонкаў былой зіноўеўскай антыпартыйнай групы вышаў зладзей, пазбавіўшы жыцця аднаго з лепшых сыноў нашай партыі. Ахвосце зіноўеўскай апазіцыі прыбегла да індывідуальнага тэрору, гэтай зброі безнадзейнага адчаю.

Не выпадкова зладзей цэліў у Сергея Міронавіча. Тав. Кіраў выкікаў да сябе заслужаную нянавісць апазіцыянераў. Гэта ён у 1926 годзе, прысланы Цэнтральным Камітэтам у Ленінград, нанёс смяротны ўдар разлагаючай рабоце зіноўеўскай групоўкі. Гэта ён згуртаваў, як ніколі, ленінградскіх большэвікоў вакол вялікага правадыра партыі таварыша Сталіна. Гэта ён вярнуў нашаму ленінградскаму арганізацыі яе старое ганаровае месца непарушнага аплоту Цэнтральнага Камітэта. Вось чаму ахвосце зіноўеўскай апазіцыі — гэтыя гнусныя найміты памешчыкаў і капіталістаў — выбрал сваёй ахвярай правадыра ленінградскай арганізацыі нашай партыі, аднаго з найбольш стойкіх байцоў за генеральную лінію Леніна—Сталіна.

Пакойны тав. Кіраў не раз указваў, што ўнутрыпартыйная барацьба мае сваю логіку, што ўсякая група, якая будзе ўпорствацаць у сваёй барацьбе супроць генеральнай лініі партыі, неміну ча рана ці позна скоціцца ў лагер контррэвалюцыі.

«Быў час, — гаварыў тав. Кіраў, — калі мы біліся з рознымі ўнутрыпартыйнымі групоўкамі па пытаннях, якія былі прынцыпова ясны і бясспрэчны для аграмаднай большасці членаў нашай партыі, але якія здаваліся спрэчнымі для той ці іншай апазіцыйнай групы. Мы біліся з імі тады ўнутры нашай партыі, але мы ў той-жа час папярэджвалі іх, што барацьба мае сваю логіку, што ўсякая група, якая будзе упорствацаць у сваёй апазіцыйнай барацьбе супроць генеральнай лініі партыі і яе ЦК, зусім неміну ча лагічна скоціцца ў лагер контррэвалюцыі».

І гэтыя групоўкі сапраўды скаціліся ад канчаткова ў памыянную яму контррэвалюцыі. Гэты момант наступіў, калі справа соцыялізма перамагла ў нашай краіне.

«Гэта ворагі соцыялізма, гэта людзі, перайшоўшыя ў лагер контррэвалюцыі, гэта прамыя пасобнікі сусветнай буржуазіі, — гаварыў тав. Кіраў аб апазіцыянерах, якія не адмовіліся ад сваіх поглядаў. З ворагамі соцыялізма, з людзьмі, якія выступаюць супроць завалявання Окцябра, мы не спрачаемся і спрачацца не збіраемся. Мы з імі вядзем барацьбу як з ворагамі, канчаткова ўшоўшымі на страну белагвардзейцаў, у лагер яўных ворагаў пролетарскай дыктатуры.

Мы папярэджвалі ў свой час правадыроў правай і «левай» апазіцыі — Зіноўева, Каменева і іншых, што калі яны своечасова не спыняцца, то прыдуць у лагер контррэвалюцыі».

Трацкістка-зіноўеўскі апазіцыйны блок 1926-1927 гг. стварыў падпольныя арганізацыі сваіх прыхільнікаў унутры нашай партыі, стаў наладжваць нелегальныя друкарні ў саюзе з буржуазнымі інтэлігентамі і прамымі белагвардзейцамі і перайшоў да наладжання адкрытых антысовецкіх дэманстрацый у Ленінградзе і Маскве ў дзесятую гадавіну Окцябрскай рэвалюцыі. Ленінградскія большэвікі памятаюць, як яшчэ ў 1926 годзе, калі пролетарыі горада Леніна згуртоўваліся пад сцягам партыі, прыхільнікі Зіноўева не адступалі перад мерамі контррэвалюцыйнага гвалту супроць барацьбітоў за ленінім. Яны зрабілі спробу акружыць «Красный путиловец» ледзь не ваенным кардонам, яны прабавалі прымяняць фізічны гвалт да большэвікоў, якія змагаліся за лінію ЦК.

Гэта было тады. А цяпер, пасля раду год, калі рабочы клас, ажыццяўляючы сталінскі план індустрыялізацыі краіны і калектывізацыі сельскай гаспадаркі, дабіўся гігантскіх дасягненняў, — сталі зусім відавочнымі поўная бязвыхаднасць становішча, поўная адсутнасць перспектыў у зіноўеўскага атрэп'я. І гэтыя падонкі сталі на шлях тэрору, падняўшы руку на аднаго з правадыроў партыі.

Агенты класавага ворага ведаюць, што яны не могуць разлічваць ні на які поспех, калі папрабуюць выступіць з адкрытай пропаведдзю сваіх контррэвалюцыйных поглядаў. Такія вялікія перамогі генеральнай лініі партыі, так цесна згуртаваны вакол яе масы пролетарыяту і працоўных сялян, што ў ворагаў партыі няма ніякіх надзей на заваяванне мас на свой бок. У іх не асталося іншай зброі, апрача індывідуальнага тэрору, апрача такі тыкі адчаю. У іх няма іншага выхаду, як укладваць палкі ў калясніцу таржаствуючага соцыялізма, як па меры сіл шкодзіць і пакасціць пролетарыяту, подла помсціцца вялікай партыі большэвікоў.

Забойства з-за вугла тав. Кірава пасланцом б. антыпартыйнай зіноўеўскай групы зноў напамінае нам аб неабходнасці той самай рэвалюцыйнай пільнасці, якой заўсёды патрабавалі ад нас тав. Сталін і пакойны тав. Кіраў. «Рэвалюцыйная пільнасць з'яўляецца той самай якасцю, якая асабліва неабходна цэлер большэвікам».

Зіноўеўскае атрэп'е для дасягнення сваіх зладзейскіх мэт прыбегла к подламу двурушніцтву Зіноўеўцы, ведучы контррэвалюцыйную барацьбу, рыхтуючы тэрарыстычныя акты супроць правадыроў нашай партыі, у той-жа час прысягалі ў вернасці генеральнай лініі партыі, каб застацца ў яе радах, лепш замаскавацца і змагацца ў падполлі супроць перамогі соцыялізма ў нашай краіне, супроць трыумфу справы Леніна—Сталіна. Гэтыя людзі надзявалі лічыну верных партыйцаў, каб тым зручней прадаўжаць барацьбу супроць рэволюцыі. Асколкі старой апазіцыі логікай барацьбы вымушаны былі стаць на шлях, які адстойвае зарубежнае белагвардзейскае «Возрождение», на шлях контррэволюцыйнага тэрору супроць правадыроў партыі. Выраджкі, разбітыя ў адкрытай палітычнай барацьбе, ізаляваныя ад мас, яны сталі прамымі агентамі класавага ворага, прыбегла да апошняга белабандыцкага фашысцкага сродку барацьбы — тэрору.

Ушаноўваючы памяць пакойнага Сергея Міронавіча, усе члены нашай партыі выканаюць яго завет — удзесяцяраць рэволюцыйную пільнасць. Мы будзем бязлітаснымі да заклятых ворагаў рабочага класа, дзейнічаючых з-за вугла, не пагарджаючых ніякімі сродкамі, не адступаючых перад самымі гнуснымі метадамі барацьбы з совецкай уладай.

Больш чым калі-небудзь згуртавана наша слаўная партыя вакол ленінскага ЦК і вялікага правадыра тав. Сталіна. Над прахам тав. Кірава члены нашай слаўнай ленінскай партыі абяцаюць давесці да канца тую справу, якой аддаў сваё жыццё правадыр пролетарыята, — і на подлую вылазку класавага ворага адказаць суровай і бязлітаснай рэволюцыйнай расправай над атрэп'ямі контррэволюцыйнай зіноўеўшчыны.

(З «Ленінградской правды»).

РАБОТА СА СПАЧУВАЮЧЫМІ—АДНА З ВАЖНЕЙШЫХ ЗАДАЧ КОЖНАЙ ПАРТЫЙНАЙ АРГАНІЗАЦЫІ

АБ РАБОЦЕ СА СПАЧУВАЮЧЫМІ НА ФАБРЫЦЫ „ОКЦЯБР"

Пастанова бюро ЦК КП(б)Б

Заслухаўшы даклад сакратара парткома фабрыкі «Окцябр» тав. Канопка і судаклад інструктара ЦК КП(б)Б тав. Скарабагацька аб рабоце са спачуваючымі, Бюро ЦК адзначае, што партком фабрыкі «Окцябр» (сакратар тав. Канопік) толькі ў ліпені месяцы гэтага года пачаў работу з даўно лічыўшыміся спачуваючымі ў колькасці 23 чал. і ўпоў прыняў у групу спачуваючых усяго толькі 28 чалавек.

Адзначаючы здавальняючы склад спачуваючых, Бюро ЦК падкрэслівае, што разам з усім нездавальняючай пастаноўкай партмасавай работы ў цэху на вытворчасці, да гэтага часу прымаюцца ў групу спачуваючых выключна толькі па вытворчых паказальніках часамі палітычна адсталыя рабочыя, а выпускаюцца з віду ўдарнікі, прымаючыя вельмі актыўны ўдзел у палітычным жыцці цэха і фабрыкі.

Гэта сведчыць аб тым, што партыйны камітэт фабрыкі не ведае яшчэ свайго актыва, недастатковы мае ўплыў на ідэйна-палітычнае жыццё рабочых і не ведае палітычнага твару кожнага рабочага-актывіста.

Аб адсутнасці ўнутрыпартыйнай работы асабліва з новымі кадрамі рабочых, сведчыць і тое, што ў групу спачуваючых не прынят ні адзін беларус. Усяго ўцягнута 5 работніц, між тым, як 67 проц. рабочых на прадпрыемстве складаюць жанчыны.

Арганізаваўшы вучобу ўсіх спачуваючых, партком не забяспечыў неабходнага падбору прапагандыстаў, папярэдні іх інструктаж перад кожнымі заняткамі і не арганізаваў вучобу са спачуваючымі, дрэнна разумеючымі беларускую мову, на яўрэйскай мове ў сувязі з тым да гэтага часу якасць партыйнай вучобы застаецца вельмі нізкай.

Многія з спачуваючых не чытаюць газет, мастацкай літаратуры. Некаторыя з іх лічаць нават забабонамі чытанне такой літаратуры. Механічна размеркавана нагрузка сярод спачуваючых, без індывідуальнага ўліку здольнасцей, жаданняў і цягі кожнага спачуваючага.

Падкрэсліваючы станоўчы вопыт адзінага дня спачуваючых, праведзімага парткомам фабрыкі «Окцябр», ЦК, аднак, указвае на няправільную канцэнтрацыю ўсёй работы са спачуваючымі толькі ў парткоме, што прыводзіць да некаторага адрыву цэхпарторга, комуністаў у цэху ад работы са спачуваючымі ў сваім цэху.

Такое становішча работы са спачуваючымі на фабрыцы «Окцябр» тлумачыцца тым, што партком фабрыкі «Окцябр» да гэтага часу яшчэ мала аддае ўвагі пытанням партыйнай работы і ў практыцы сваёй работы падмяняе гаспадарчае і прафесіянальнае кіраўніцтва.

Наяўнасць такой работы са спачуваючымі на адной з самых буйных фабрык горада Менска сведчыць, што Менскі гарком не арганізуе работы са спачуваючымі ў пярэдніх партарганізацыях і яшчэ мала звяртае ўвагі на пытанні партыйнай работы.

Бюро ЦК звяртае сугубую ўвагу ўсёй партарганізацыі Беларусі усіх ГК і РК КП(б)Б, парткомаў і парторгаў пярэдніх партыйных арганізацый на рэзкае адставанне КП(б)Б у справе перабудовы партыйнай работы ў адпаведнасці з патрабаваннямі, прад'яўленымі рашэннямі XVII з'езда партыі; на неабходнасць рашучага павароту тварам да партыйнай работы. ГК і РК КП(б)Б абавязаны ўзмацніць увагу партыйнай рабоце, па-большэвіцку вырашыць рад такіх надзённых пытанняў партыйнага жыцця, як работа са спачуваючымі, з кандыдатамі партыі, комуністамі-адзіночкамі, правядзенне адзіных партдзён, змяненне складу партарганізацыі (бягучасць, улік і т. д.), парткіраўніцтва комсамолам, гарадскімі арганізацыямі, дабіваючыся поўнай ліквідацыі фактаў падмены совецкіх, гас падарчых і прафесіянальных органаў у іх рабоце, ліквідацыі элементаў голага адміністравання.

Асноўнай задачай парткома фабрыкі «Окцябр» і Менскага гаркома з'яўляецца больш глыбокая партыйна-масавая работа з беспартыйным актывам, работа з кожным рабочым і асабліва ўдарнікам, уцягваючы іх у актыўнае палітычнае жыццё шляхам лепшай пастаноўкі парт. і комсамольскіх, больш удумлівай падрыхтоўкі пытанняў на гэтыя дні.

ЦК звяртае асаблівую ўвагу парткомаў на задачу арганізацыі школ гурткоў спачуваючых, ахоп кожнага спачуваючага партыйнай адукацыяй, глыбокай прапрацоўкі статута і праграмы партыі, пастаноў XVII з'езда партыі, павышаючы гэтым самым ідэйна-палітычны ўзровень спачуваючых на вытворчасці.

Для выхавання спачуваючых абавязаць ГК падбраць больш праверэных і падрыхтаваных прапагандыстаў і арганізаваць сістэматычны інструктаж прапагандыстаў да кожных заняткаў.

ЦК асаблівую ўвагу звяртае на неабходнасць арганізацыйнага і ідэйнага ўплыву на кожнага рабочага, асабліва на работу з работніцамі і беларускімі кадрамі рабочых, на іх вырошчванне і выхаванне.

Прапанаваць парткому забяспечыць прымацаванне больш падрыхтаваных комуністаў індывідуальна да кожнага спачуваючага.

ЦК абавязвае ГК і РК КП(б)Б неадкладна работу са спачуваючымі паставіць у парадак дня сваёй штодзённай работы, як праніда на сваіх пасяджэннях заслухоўваць партыйныя камітэты і парторгаў аб рабоце сярод спачуваючых і выпрацоўваць недахопы, якія ёсць у справе арганізацыі груп спачуваючых.

Абавязаць усе ГК і РК КП(б)Б па працягу лістапада месяца правесці адзіны партдзень па пытанню аб рабоце са спачуваючымі.

Бюро ЦК таксама падкрэслівае, што вытворчыя аддзелы ЦК (сельскагаспадарчы, прамысловы, совецка-гандлёвы) нездавальняюча займаюцца работай груп спачуваючых і даручае гэтым аддзелам арганізаваць сістэматычную праверку работы са спачуваючымі ў пярэдніх партарганізацыях.

Даную пастанову апублікаваць у друку.

БОЛЬШ УВАГІ ПЫТАННЯМ РАБОТЫ СА СПАЧУВАЮЧЫМІ

Гаворачы аб далейшым росце і папаўненні радоў партыі, ЦК ВКП(б) сказаў, што «групы спачуваючых павінны з'явіцца галоўнейшымі каналамі, па якіх будзе ісці папаўненне партыі новымі членамі».

Указанне ЦК ВКП(б) аб далейшым росце партыі з усёй астратой ставіць пытанне перад партыйнымі арганізацыямі аб выключнай увазе да пытання работы са спачуваючымі, не праведзенымі па чыстцы партыі, не пакідаючы ніводнага комуніста, неправедзенага ў спачуваючыя за палітычную нязграматнасць, без уплыву партыйнай арганізацыі, усямерна да памагаючы гэтым людзям павышаць сваю палітычную граматнасць, дамагчымасць ім вярнуцца ў рады партыі.

З другога боку ЦК ВКП(б) гэтым указаннем яшчэ раз напамінае і абавязвае нас як мага больш аддаваць увагі і лепш арганізоўваць палітыка-выхаваўчую работу з беспартыйнымі рабочымі, вылучаючы з іх радоў лепшых ударнікаў, людзей, якія на сваёй практычнай рабоце паказваюць сваю адданасць партыі, людзей, якія бліжэй стаяць каля партыі, каб з гэтых лепшых людзей, ударнікаў вытворчасці, арганізоўваць групы спачуваючых і праз групы спачуваючых падрыхтоўваць іх у рады партыі.

Але, на вялікі жаль, многія партыйныя арганізацыі Беларусі. У тым ліку і прамысловыя (Гомель, Бабруйск, Магілеў, Віцебск і інш.), дагэтуль яшчэ сур'ёзна не заняліся работай са спачуваючымі, праведзенымі па чыстцы партыі, а таксама па ўпячэнню новых спачуваючых.

Выключна мала аддаецца ўвагі пытанню арганізацыі новых груп спачуваючых пры пярэдніх партыйных арганізацыях. З 2129 пярэдніх партыйных арганізацый КП(б)Б толькі 224 маюць групы спачуваючых, што складае ўсяго 10 проц. агульнага ліку пярэдніх партарганізацый. Такая нізкая колькасць груп спачуваючых у КП(б)Б тлумачыцца тым, што ўнутрыпартыйная і масавая работа не стала яшчэ асновай работы многіх партыйных арганізацый.

Адсутнасць адпаведнай работы парткома Бабруйскага лесакамбіната прывяла да таго, што з 21 чал., неправедзенага ў спачуваючыя па чыстцы, асталося толькі 11.

Сталіншы 50 проц. складу спачуваючых, партком толькі ў жніўні гэтага года заняўся работай са спачуваючымі, праведзенымі па чыстцы, і на працягу жніўня новых прыняў усяго толькі 5 чалавек.

На фабрыцы імя Халтурына (Бабруйск) па чыстцы партыі праведзены ў спачуваючыя 2 работніцы—тт. Салавенка і Лялехава. Абедзве—малаграматныя. Партарганізацыя фабрыкі замест таго, каб арганізаваць сістэматычную палітыка-выхаваўчую работу з імі, прымацаваць для індывідуальнай работы моцных комуністаў, дапамагчы гэтым работніцам падрыхтавацца для ўступлення зноў у партыю, лічыць, што «з гэтых спачуваючых нічога не будзе», а адсюль і не трэба з імі весці ніякай работы. Нагрузкі гэтым работніцы таксама ніякай не маюць.

У практыцы афармлення новых спачуваючых наглядаецца павольнасць, вялікая запяжка. Так, на Бабруйскім лесакамбінаце рабочы біржы піламатэрыялаў тав. Ясюкзе падаў заяву аб прыёме яго ў спачуваючыя 22 мая, партарганізацыя-ж цэха разгледзела яго заяву 7 ліпеня, а парткомам ён прынят толькі 23 жніўня, г. зн. роўна праз тры месяцы.

Рабочы лесапункта № 3 тав. Хромаеў заяву аб прыёме ў спачуваючыя падаў 21 мая, а прынят парткомам 5 жніўня.

Як недахоп у рабоце партарганізацыі і Бабруйскага камбіната і іншых прадпрыемстваў, трэба адзначыць тую акалічнасць, што пры прыёме ў спачуваючыя партарганізацыя цэха, асобныя комуністы слаба вывучаюць палітычны твар, настрой, запросы прымаемага, наколькі гэты чалавек стаіць блізка к партыі.

Паказальнікамі, па якіх у большасці прымаюць у групу спачуваючых, з'яўляюцца вытворчыя паказальнікі. Напрыклад, на тым-жа Бабруйскім лесакамбінаце ў групу спачуваючых 7 жніўня ў лесапуну № 3 былі прыняты 4 чал. рабочыя-«ўдарнікі» (Русецкі, Герман, Кіраў і Грэдасеў), на якіх потым паступіў кампраметуючы матэрыял. Сярод гэтай групы аказаліся антысеміты, быўшыя ў мінулым пад судом, чыноўнікі і выключаныя з партыі. Сярод гэтых людзей аказаліся людзі, якія толькі 6 месяцаў працуюць на камбінаце.

Не не многа лепш абстаіць работа са спачуваючымі на Менскай шазэйнай фабрыцы «Окцябр». Праўда, да ліпеня гэтага года партком фабрыкі зусім не ведаў аб існаванні 23 чал. спачуваючых, праведзеных па чыстцы партыі, і гэтыя 23 чал. былі прадастаўлены самі сабе.

Пачаўшы работу са спачуваючымі, праведзенымі па чыстцы, партком з ліпеня зноў прыняў у групу спачуваючых 28 чалавек.

Тут, як і на Бабруйскім камбінаце, пры прыёме ў спачуваючыя ўлічваюць толькі вытворчыя паказальнікі, а палітычны твар, яго настрой, яго адносіны да грамадска-палітычнага жыцця зусім забываюцца. Адсюль часамі ў цэхах прымаюць і палітычна-адсталых рабочых, а ў той-жа час у гэтых-жа цэхах упускаюць з-пад увагі перадавых актыўных у вытворчым і палітычным жыцці цэха рабочых.

Адсутнасць сістэматычнай партыйна-масавай работы ў цэху з беспартыйным актывам, у асаблівасці з рабочымі-беларусамі і жанчынамі-работніцамі, прывяла да таго, што сярод 28 чалавек, новапрынятых у спачуваючыя, ёсць толькі 5 работніц, а на фабрыцы жанчыны складаюць 67 проц. Таксама няма ні аднаго рабочага-беларуса.

Да пытання размеркавання нагрузак спачуваючым партком фабрыкі палышоў механічна, без індывідуальнага ўліку жаданняў і адольнасцей чалавека.

Новапрыняты ў спачуваючыя тав. Аксельрод надта многа чытаў і чытае мастацкай літаратуры і мог-бы праводзіць вялікую работу па рэкамендацыі рабочым мастацкай літаратуры, мог-бы арганізаваць масавую чытку белетрыстыкі сярод рабочых свайго цэха, але яму супроць яго жадання далі нагрузку па рабоце ў ОЗЕТ'е.

Спачуваючаму тав. Ляўкову далі нагрузку старшыні фабрычнай РКК, і ні фабком, ні партком ні разу не пацікавіліся, як жыве і працуе тав. Ляўкоў, з якімі ён труднасцямі практыцы работы сустракаецца і якую дапамогу трэба яму аказаць. Такое-ж становішча і з спачуваючай тав. Трачынскай.

Партыйная вучобай праведзеных па чыстцы, а таксама нова-прынятых спачуваючых ахоплены поўнасцю. Але партком мала ўвагі а пытанню падбору прапагандыстаў, правядзення з імі адпаведнага інструктажу перад кожнымі заняткамі, арганізацыі спецыяльных палітшкол для спачуваючых, дрэнна ўладаючых рускай і беларускай мовамі. Усё гэта на многа знізіла якасць самой вучобы.

Сярод спачуваючых вельмі нізкае ны процант падпісчыкоў, якія чытаюць газеты, і адзін толькі тав. Аксельрод чытае мастацкую літаратуру. Асобныя-ж таварышы прама лічаць, што чытанне мастацкай літаратуры — гэта «нешта ганьбячае спачуваючага». Масавай-жа чыткі газет, асобных артыкулаў па міжнароднаму і ўнутраному становішчу сярод рабочых абсалютна не праводзіцца.

Арганізацыі масавай чыткі газеты ў цэху, у часе абедзенага перапынку, у часе адачы змены ўзята супрацьлеглая сам сакратар парткома фабрыкі «Окцябр» тав. Канопік, усямерна даказваючы, што гэта ва ўмовах работы фабрыкі правесці немагчыма. Замест-жа чыткі праводзіць пяцімінутныя інфармацыі аб тым «што і дзе робіцца», лічачы, што гэтага зусім дастаткова і што гэтым можна замяніць чытку газеты.

Не гледзячы на тое, што сярод спачуваючых большасць таварышоў маюць вельмі слабы палітычны гарызонт, заходта слаба разбіраюцца ў бягучых пытаннях, партком дагэтуль не выкарыстаў форму індывідуальнага прымацавання моцных палітычна-граматных комуністаў да спачуваючых, якія слаба разбіраюцца ў пытаннях палітыкі партыі, каб прымацаваныя таварышы дапамаглі ім ліквідаваць сваю палітычную нязграматнасць.

Партком шкёйнай фабрыкі «Окцябр» з верасня пачаў праводзіць спецыяльныя дні спачуваючых. У гэтыя дні збіраюцца ўсе спачуваючыя—і раней праведзеныя па чыстцы партыі, і новапрынятыя. На сходзе ставіцца адно з пытанняў, якое больш за ўсё цікавіць групу спачуваючых. Пасля схода ўся група спачуваючых разам ідзе ў кіно, тэатр, наведвае кватэры асобных таварышоў. Правядзенне гэтых дзён дае надзвычай добрыя вынікі. Спачуваючыя даюць добрыя водгукі аб гэтых днях. Але для таго, каб дасягнуць удалых вынікаў, патрэбна адпаведная падрыхтоўка да гэтых дзён. Гэту падрыхтоўку неабходна праводзіць непасрэдна ў цэху, на вытворчасці, прыцягваючы для гэтай работы парторгаў цэхаў. Гэтага якраз нельга сказаць аб парткоме фабрыкі «Окцябр». Тут у падрыхтоўцы да дня спачуваючых амаль не прымаюць удзелу парторгі, а ўсю падрыхтоўчую работу праводзіць сакратар парткома тав. Канопік. Канцэнтрацыя ўсёй работы са спачуваючымі ў парткоме прыводзіць да адрыву парторгаў цэхаў ад спачуваючых і наадварот.

Правядзенне спецыяльных дзён неабходна ў далейшым шырока практыкаваць, але трэба больш увагі аддаваць пытанню падрыхтоўкі да гэтага дня. У гэту работу трэба ўцягваць парторгаў цэхаў, асобных комуністаў, якія з пералку індывідуальнай гутаркі з кожным у пасядоку спачуваючым павінны высветліць якія пытанні больш за ўсё цікавяць спачуваючых і што неабходна паставіць на чарговым сходзе спачуваючых. Усе гэтыя пытанні парторгі павінны перадаваць парткому, дае ўжо канчаткова зацвярджаюцца пытанні, якія павінны стаяць на чарговым дні спачуваючых.

Партарганізацыі Беларусі заражка павінны карэнным чынам палепшыць работу з групамі спачуваючых, арганізацыйна ахапіць беспартыйны актыў, які рыхтуецца для прыняцця ў спачуваючыя, замацаваць яго ў групах спачуваючых і падрыхтаваць для ўступлення ў партыю.

Больш увагі трэба аддаваць на пытанне вывучэння спачуваючымі статута і праграмы партыі, на арганізацыю палітшкол і гурткоў спачуваючых. Трэба ахапіць кожна га спачуваючага партыйнай вучобай і дабіцца, каб кожны спачуваючы рэгулярна чытаў газеты.

Н. СКОРАБАГАЦЬКА.

Выгрузка хлеба ў хлебным магазіне.

СКАРЫСТАЦЬ КОЖНЫ ДЗЕНЬ ДЛЯ СВОЕЧАСОВАЙ ПАДРЫХТОЎКІ І ПРОДАЖУ ХЛЕБА

Вынікі рэйдаў рабселькораўскіх брыгад, арганізаваных «Звяздой», сведчаць аб тым, што рад раённых работнікаў праяўляюць паўнейшую бяздзейнасць у рэалізацыі пастановы лістападаўскага пленума ЦК ВКП(б).

Начальнік ОРС'а Аршанскага вузла тав. **Саламонаў** проста займаецца «очковтирательством». Ён запэўняў грамадскасць, што магазіны будуць гатовы ў тэрмін. Пры праверцы выявілася, што намечаныя тэрміны даўно ўжо прайшлі, і зрыў будаўніцтва крам відавочны.

Рамонт магазінаў праходзіць агідна. Паліцы будуюцца вышынёй да столі, з сырога дрэва. Хлеб і кандэцерскія вырабы на гэтых паліцах будуць псавацца.

Хлебакамбінат Аршанскага ОРС'а таксама не гатоў да чашырэння асартыменту выпечкі. Дырэктар **Слонім** спасылаецца на адсутнасць дырэктыў з Менска і бланкаў для заключэння дагавароў з ОРС'амі на снабжэнне іх хлебам, спасылаецца на тое, што ён не ведае (!) адпускных цэн на хлеб. Атрымліваецца нейкае зачараванае кола, — пішуць у сваім матэрыяле 8 брыгадзіраў «Звязды». Саламонаў спасылаецца на Белгандаль і хлебакамбінат, кіраўнікі-ж хлебакамбіната спасылаюцца на Менскі ОРС. Адна арганізацыя не ведае, што яна аможа даць, а другая, што яна павінна ўзяць. У ОРС'е да гэтага часу не вырашана пытанне аб гандлі мукой і крупамі.

І наогул, трэба сказаць, — робяць вывад брыгадзіры, — на Аршанскім чыгуначным вузле справа з падрыхтоўкай да разгорнутага гандлю хлебам зусім правалена.

Яшчэ горш у **Чэрвеньскім раёне**. Кіраўнікі раённых арганізацый нават і не думаюць аб выкананні пастаноў пленума на разгортванню вольнага гандлю хлебам.

Белхарчгандлю катэгарычна забараніў адкрыць у раёне дзве крамы па гандлю мукой і крупамі.

ОРС і райсаюз не ведаюць, колькі тон хлеба яны павінны выпускаць штодзённа. Не ведае ніхто ў раёне, які асартымент хлебных вырабаў будзе выпякацца.

Прадаўцоў ніхто не рыхтуе. Начальнік ОРС'а тав. **Арлоўскі** прама заяўляе: «Нам няма каго рыхтаваць, у нас крамы ёсць, загадчыкі будуць старыя».

Паміж райсаюзам, Белхарчгандлем і ОРС'ам няма ніякай дагаворанасці. Кожны будуе, як кажуць, на свой страх і рызыку. Не вырашана таксама пытанне і аб транспарце. ОРС толькі думае зрабіць 5 будак для развозкі хлеба па крамах. Райсаюз «не ведае», адкуль ён будзе атрымліваць муку. У яго няма транспарту для падвозкі зярна, мукі і гатовага хлеба.

Брыгада друку ў складзе 6 чалавек, праверыўшы становішча з рамонтам памяшканняў пад крамы і пякарні, звярнулася да сакратара Чэрвеньскага райкома партыі тав. **Васільеў** з запытаннем, што РК партыі думае зрабіць для таго, каб своечасова пачаць продаж хлеба. На гэта тав. Васільева адказала:

— Што будзе — не ведаю.

Яшчэ больш агіднае становішча ў **Чэрыкаўскім** раёне. Там павінны быць капітальна адрамантаваны 2 крамы па лініі спажывецкай каперацыі і дзве крамы па лініі Дзяржгандля. ОРС леспрамгаса тав. сама павінен падрыхтаваць 7 крам, пабудаваць новую пякарню. У гарадскіх пякарнях трэба пакінуць пераласці тры печы. Да гэтага часу не праверана спраўнасць млыноў, крупарушак, не хапае трох спецыялістаў-пекараў, не падабраны прадаўцы хлеба, не хапае гір і транспарту.

Не лепш і ў **Пухавіцкім раёне**. Там ёсць толькі адна невялікая пякарня, з працускной здольнасцю ў 4 тоны за суткі. Яна ніяк не можа задаволіць патрабаванняў спажыўца ў печаным хлебе. Толькі зараз пачалі клапаціцца аб рамонце існуючай пякарні і «мабілізавалі»... адну фурманку на падвоз цэглы. У раёне яшчэ таксама мяркуюць пабудаваць адну печ у м. Шацку і другую у м. Дукоры. Пабудова гэтых пякарань фактычна сарвана. Прыльней, будаваць яшчэ не пачалі.

Будаўніцтва гандлёвых памяшканняў недапушчальна зацягваецца. Ёсць пагроза, што да 25 снежня крамы не будуць гатовы. Ні адна крама ў раёне не забяспечана вопытнымі прадаўцамі. Толькі ў апошнія дні гэтага месяца мяркуюць правесці курсы прадаўцоў хлеба выключна для двух цэнтральных крам.

У раёне не ўлічылі і таго, што неабходна будзе прадаваць муку і крупы. Для гандлю імі нічога не зроблена. А райком КП(б)Б (сакратар тав. **Скараход**), як паведамляе наш спецыяльны карэспандэнт т. Лось, мала цікавіцца падрыхтоўкай да продажу хлеба і гэтым важнейшым участкам амаль не кірур.

Рашэнні лістападаўскага пленума ЦК ВКП(б) аб адмене картачнай сістэмы на хлеб і некаторыя іншыя прадукты патрабуюць ад усіх работнікаў, асабліва ад кіруючых, сугубай аператыўнасці, асабістага кіраўніцтва будаўніцтвам новых печаў, крамнай сеткі.

Прыведзеныя намі прыклады гавораць аб тым, што асобныя кіраўнікі, у прыватнасці Аршанскага чы гуначнага вузла, Пухавіцкага і Чэрвеньскага раёнаў, не зразумелі гэтых важнейшых умоў у барацьбе за разгорнуты гандаль хлебам, не ўвайшлі ў сутнасць справы, не працуюць самі і не прымушаюць працаваць кіраўнікоў гандлёвых прадпрыемстваў — райсаюзаў, ОРС'аў і Дзяржгандля.

Трэба, нарэшце, зразумець, што да адкрыцця разгорнутага гандлю хлебам асталося 8 дзён. За гэтыя дні мы павінны завяршыць усю падрыхтоўчую работу.

С. Ц.

Усебеларускі паход за асваенне мастацкай літаратуры

ЛІТАРАТУРНЫ ПАХОД ПАВІНЕН СТАЦЬ СПРАВАЙ ШЫРОКІХ МАС

РК і палітаддзелы павінны раўняцца па Аршанскаму РК і палітаддзелу Даманавіцкай МТС

Сотні й тысячы калгаснікаў селі за стол слухаюць, як чытаюць мастацкую літаратуру, слухаць, як нашы пролетарскія пісьменнікі расказваюць пра барацьбу за новае соцыялістычнае жыццё, пра барацьбу з царскімі жандарамі, белапольскімі акупантамі, «сваімі» і чужымі панамі, кулакамі, дарамедамі.

Паход за асваенне мастацкай літаратуры ў цэлым радзе раёнаў (Орша, Барысаў, Касцюковічы, Крычаў, Мозыр і інш.) сапраўды стаў справай шырокіх мас. Прага да літаратурных ведаў ахапіла дзесяткі тысяч працоўных. Літаратурны паход пачынае прымаць такія шырокія размеры, што, каб крыху больш арганізацыйнай ініцыятывы ў цэлым радзе раёнаў, якія ніяк яшчэ не могуць раскачацца, мы маглі-б уцягнуць у гэты рух не дзесяткі, а сотні тысяч чалавек.

Аб гэтым з усёй відавочнасцю сведчаць даклады прадстаўнікоў Аршаншчыны і Мазыршчыны 20 снежня на пасяджэнні цэнтральнага штаба па кіраўніцтву паходам за асваенне мастацкай літаратуры.

Ад Аршаншчыны даклад'ваў намеснік сакратара райкома партыі тав. Спасаў.

2149 СЛУХАЧОЎ У ЛІТАРАТУРНЫХ ГУРТКАХ

— Што мы зрабілі для практычнага ажыццяўлення абавязкаў узятых намі ў адозве да ўсёй партыйнай, совецкай і комсамольскай грамадскасці Совецкай Беларусі аб разгортванні літаратурнага паходу? — пачынае свой даклад тав. Спасаў.

— Мы мабілізавалі 15 чалавек гарадскога актыва, якія былі пасланы ў калгасы і сельсоветы для таго, каб непасрэдна ў калгасах арганізаваць запіс у гурткі, падабраць літаратуру і кіраўнікоў для чыткі. Гэтыя таварышы збіралі настаўнікаў, культурныя сілы вёскі і канкрэтна з кожным з іх дагаварваліся аб практычнай рабоце.

Такім чынам райкому ўдалося ахапіць літаратурнымі гурткамі ўсе 32 сельсоветы раёна. У кожным сельсавеце зараз мінімум ёсць адзін гурток. У некаторых сельсаветах арганізавана па 4-6 гурткоў.

Апрача спецыяльна пасланых людзей мы гэту справу таксама даручылі парторгам на мясцах і інструктарам, якія абгаварылі гэта пытанне на адным з чарговых сходаў з комуністамі-адзіночкамі. Такім чынам нам удалося стварыць закон літаратурнага паходу шырокі рух, у які былі ўцягнуты калгасныя масы. І ў выніку мы маем у раёне 80 гурткоў, якія працуюць сістэматычна.

Чытаюць у гуртках наступныя кнігі: «Паднятая цаліна» М. Шолахава, «Мать» Максіма Горкага, «Дрытва» Якуба Коласа, «Спектаклі не загонах» Галавача, «Цені на сонцы» Андрэя Александровіча. Зачытвалі таксама на радзе гурткоў даклад Максіма Горкага на ўсесаюзным з'ездзе совецкіх пісьменнікаў. Але ў пераважнай большасці гурткоў чытаюць «Паднятую цаліну». Як правіла, чытаюць ад адной да двух гадзін, чытаюць і тут-жа абгаварваюць. Збіраюцца дзве як большасць гурткоў раз у пяцідзённку, а некаторыя і раз у дэкаду. Як правіла, сістэматычна, раз у пяцідзённку працуюць тыя гурткі, да якіх прымацаваны студэнты рабфака і педтэхнікума.

Па нашаму дакладнаму пладзіку зараз літаратурнымі гурткамі, якія працуюць на вёсцы, ахоплена 2.149 чалавек. Сюды не ўваходзіць значная колькасць людзей, ахопленых гурткамі працуючых на прадпрыемствах горада і раёна. Так, напрыклад, мы арганізавалі 7 літаратурных гурткоў на торфараспрацоўках, у якіх сістэматычна слухаюць літаратурныя чыткі 300 чалавек. 110 чалавек уваходзіць у пяць літаратурных гурткоў, арганізаваных на БелДРЭС'е. Апрача таго на БелДРЭС'е былі праведзены два літаратурныя вечары, у якіх прынялі ўдзел 400 чалавек. Працуе таксама літаратурны гурток з 24 чалавек на механічным заводзе «Чырвоны барацьбіт», дзе чытаюць «Дрытву» Якуба Коласа і «Мать» Горкага.

Дагэтуль мы не арганізавалі пастаянных літаратурных гурткоў на чыгунцы. Сіламі вучняў старшых груп 10-й гарадской школы арганізовая гурток для рабочых-ударнікаў чыгункі. Збіраюцца на кватэры рабочых. Чытаюць «Паднятую цаліну» і «Мать» Горкага.

Кіруюць гурткамі ў асноўным настаўнікі і студэнты.

Разгортванне літаратурнага паходу ў значнай меры залежала ад таго, як старшыні калгасаў стварылі для гэтага патрэбныя ўмовы: памяшканне, яго ацяпленне, асвятленне і т. д. Не ўсе старшыні калгасаў адразу зразумелі ўсю палітычную і культурную важнасць літаратурнага паходу. Раённай газеце, раённаму штабу, райкому партыі прышлося належным чынам растлумачыць таварышам неабходнасць забеспячэння нармальных умоў для правядзення масавых чытак. Цяпер мы можам сказаць што з гэтага боку ў нас справы абстаяць здавальняюча.

Горш было з мастацкай літаратурай. Яе не хапіла. За гэту справу ўзяўся комсамол, школьнікі, піянеры горада. Мы арганізавалі па гораду збор мастацкай і палітычнай літаратуры для гурткоў. У першую чаргу аднукуліся бібліятэкі. Апрача таго, нам удалося сабраць 1.200 экземпляраў рознага роду кніг, у тым ліку па 10-15 экземпляраў з кніг, прадугледжаных літаратурным мінімумам.

Безумоўна, пры наяўнасці патрэбнай літаратуры мы маглі-б арганізаваць значна большую колькасць гурткоў і ахапіць імі куды больш калгаснікаў. Справа ўцяраецца ў адсутнасць патрэбнай літаратуры.

Мы ўзялі на сябе абавязак укамплектаваць калгасныя бібліятэкі. Кожны калгас паставіў перад сабой задачу — набыць мастацкую і палітычную літаратуру мінімум на 100 рублёў. Грошы сабраны. Зараз усё залежыць ад таго, як Белдзяржвыдавецтва зможа задаволіць наш попыт.

Дагэтуль мы яшчэ не скарысталі для літаратурнага паходу радыёперадачы. Няма радыё-рупароў. А на рупары вельмі вялікі попыт з боку калгаснікаў. Тым не менш усё-ж можна і трэба было скарыстаць радыё, хоць-бы для слухачоў той колькасці радыёкропак, якія ёсць у раёне.

Слаба ў нас яшчэ працуе раённы штаб, які за ўвесь час збіраўся толькі тры разы. На штабе мы ні разу не заслухалі ніводнага кіраўніка гуртка.

Добра асвятляе паход раённая газета «Ленінскі прызыў».

«ВОСЬ ТАК ЯНО І Ў НАШЫМ СЕЛЬСОВЕЦЕ БЫЛО»

Прадстаўнік Мазыршчыны — рэдактар палітаддзельскай газеты Даманавіцкай МТС т. Дубравіцкі— расказаў аб разгортванні паходу на Мазыршчыне.

— Усё яшчэ не ўзяўся як належыць за гэта райком партыі, які пакуль што налічвае па сваёй зоне не больш трох літаратурных гурткоў. Крыху лепш справа ў зоне МТС, дзе арганізавана і сістэматычна працуюць 17 гурткоў, якія галоўным чынам чытаюць «Паднятую цаліну». У цэлым радзе гурткоў чытку «Паднятай цаліны» закончылі. Гэтымі днямі заканчваюць чытку яшчэ ў 6-7 гурткох. І мы ў канцы снежня склікаем канферэнцыю ўсіх чытачоў «Паднятай цаліны».

Ужо зараз трэба адзначыць, што на пярэдніх абгаварэннях прачытанага калгаснікі прымаюць актыўны ўдзел. Вельмі часта можна пачуць выгукі: «Вось так яно і ў нашым сельсавеце было».

Кіруючы гурткамі пераважна пастаўнікі — партыйцы, комсамольцы, ёсць і беспартыйныя.

На кожнай чытцы ў гурткох, апрача пастаянных слухачоў, бывае 40-50 чалавек так званых вольных слухачоў. Пастаянныя слухачамі пераважна з'яўляюцца брыгадзіры паляводчых і жывёлагадоўчых брыгад, звяніводы і комсамольцы. Нямала ў гурткох старыны-калгаснікаў. У калгасе «Новый Халодніцкі» з агульнага ліку 25 пастаянных слухачоў — 15 жанчын. І трэба сказаць што яны надзвычай актыўна наведваюць гурткі.

Вельмі многа залежыць ад таго, як кнігу чытаць. Былі і такія раўнікі, якія чыталі вельмі нудна, не ўмелі зацікавіць калгаснікаў. Прышлося такіх змяняць.

Значнай увагі патрабуе методыка чытання. Калі калгаснік раз у 5-6 дзён наведвае гурток, а кнігі чытаюцца па разделах, дык яму цяжка ўспомніць тое, што чытаў на мінулым сходзе. Для гэтага мы практыкуем такі метад работы. Настаўнік перад пачаткам чытання перадае ў 20-30 словах, чым скончыўся папярэдні раздзел. Пасля гэтага ён дае слова некаторым калгаснікам, каб яны ўспомнілі прачытанае. Гэта займае мінут 20-25. Пасля гэтага пачынаецца далейшая чытка. У канцы чыткі — невялікі абмен думкамі аб прачытаным. У працэсе чытання нямала бывае выпадкаў, калі тое ці іншае слова незнаёмае слухачам. Тады настаўнік перапыняе чытанне, просіць якога-небудзь калгасніка сваімі словамі растлумачыць незразумелае а потым сам дае свае тлумачэнні.

Варта адзначыць што калгаснікі ў часе выбараў у сельсоветы ўключылі пытанне літаратурнага паходу ў наказ сельсавету. Гэта таксама значна спрыяла разгортванню паходу.

Зараз мы стаім перад пагрозай спынення работы ў некаторых гурткох з прычыны таго, што значная частка калгаснікаў уязджае на лесавывазкі. Гэту акалічнасць мы ўлічылі. На лесаўчастках Хацімскага сельсавета, дзе працуе значная колькасць працоўнай моладзі, мы ўжо арганізавалі гурток, дзе чытаюць «Паднятую цаліну». З саміх калгаснікаў мы выдзелілі добра граматных людзей, якія праводзяць чытку. Па сканчэнні чыткі мы мяркуем там склікаць канферэнцыю для абгаварэння прачытанага.

ПРАЧЫТАНЫЯ КНІГІ ПАВІННЫ АБАВЯЗКОВА АБГАВАРВАЦЦА

Даклады прадстаўнікоў Аршаншчыны і Мазыршчыны паказалі, што ў гэтых раёнах літаратурны паход сапраўды разгарнуўся, што раённыя арганізацыі, як напрыклад Аршанскі райком партыі, гэтаму пытанню надае вялікую ўвагу. Перад гэтымі раёнамі гэтак сама як і перад Крычаўскім, Касцюковіцкім, Барысаўскім, дзе працуе значная колькасць гурткоў, стаіць пытанне не столькі колькаснага росту, як пытанне ўзняцця якасці работы гурткоў. У першую чаргу гэта азначае, каб абавязкова ўсе прачытаныя кнігі абгаварваліся на гуртках.

Трэба абавязкова дабіцца, каб на ўсіх раёнах былі вылучаны і працавалі штабы па кіраўніцтву паходам. Штабы павінны на працягу бліжэйшых тыдняў заслухаць даклады кіраўнікоў гурткоў з тым, каб своечасова можна было ім арганізаваць патрэбную дапамогу.

Амаль ва ўсіх раёнах ёсць магчымасць выкарыстаць у мэтах літаратурнага паходу радыёперадачы, асабліва не пяяка перадаваць такія паэмы, як «Над ракой Арэсай» Янкі Купалы, «Цені на сонцы» Андрэя Александровіча і іншыя.

Ні ў якім разе далей непярэшма, што большасць раённага і цэнтральнага друку сабатуе асвятленню літарат

За рубяжом

БАІ У ГАРАХ АСТУРЫІ

РЭВОЛЮЦЫЙНЫЯ ГАРНЯКІ АБСТРЭЛЬВАЮЦЬ УРАДАВЫЯ ВОЙСКІ

У ПАРЫЖ, 21 снежня (БЕЛТА). «Дыярыо ды Мадрыд» паведамляе аб сапраўдных балях, якія адбываюцца ў гарах Астурыі паміж мяцежнікамі і ўрадавымі войскамі. Частраны прамадзянскай гвардыі і войскі — пішна «Дыярыо ды Мадрыд»—скінулі было царчана зрабіць выбухі ў гарах Чэнгаціе-Арб'ча і ваколіцах Само і Ланрэо, былі абстрэлены 18 снежня рэвалюцыянерамі, якія паваліся ў абозах, выкінутых на скілах гор. Паколькі такія сутычкі становяцца ўсё больш шматлікімі, асабліва ў раёне Само, камандзір астурыйскіх войск у ягодзе з губернатарам рапарт прапрыняць шырокія аперацыі, каб ачысціць гэты раён ад рэвалюцыйных элементаў».

Працэс нацыянал-соцыялістаў у Літве

ПА УКАЗЦЫ БЕРЛІНА ФАШЫСТЫ ПАДРЫХТОВУВАЛІ УЗБРОЕННАЕ ПАЎСТАННЕ

КАУНАС (КОВНА), 20 снежня. (БЕЛТА). Літоўская тэлеграфнае агенцтва паведамляе: «Сёння на судзе прадаўжалася чытанне абвінавачэння акта. У абвінавачэнні адзначаецца, што Засс з 1929 года з'яўляўся членам германскай нацыянал-соцыялістскай партыі. Засс арганізаваў партыю «Хрысціяне-соцыялістышэ арбейтсгемейншафт» («Хрысціянска-соцыялістычнае таварыства») на ўзор германскай нацыянал-соцыялістскай партыі. У чэрвені 1933 года Засс наведаў Берлін для ведзення перагавораў з прадстаўнікамі нацыянал-соцыялістскай партыі.

Органы германскай нацыянал-соцыялістскай партыі ва ўсходняй Прусіі ўмешваліся ў справы партыі «Хрысціяне-соцыялістышэ арбейтсгемейншафт» і «Соцыялістышэ фольксгемейншафт» («Соцыялістычнае народнае таварыства»). Органы германскай нацыянал-соцыялістскай партыі было загадана кіраваць нацыянал-соцыялістскім рухам на тэрыторыі Клайпеда (Мемельская вобласць).

Роцін таксама паехаў у 1933 г. у Берлін для перагавораў з прадстаўнікамі замежнага аддзела нацыянал-соцыялістскай партыі. Роцін быў прыняты Гесам. Германскі генеральны консул і віцэ-консул у Клайпедзе прынялі актыўны ўдзел ва ўладжванні разгалассяў паміж партыяй «Соцыялістышэ фольксгемейншафт» і партыяй «Хрысціяне-соцыялістышэ арбейтсгемейншафт». У 1933 годзе консул Штрак пусціў кават у ход пагрозы для таго, каб прымусіць членаў «Хрысціяне-соцыялістышэ арбейтсгемейншафт» далучыцца да партыі «Соцыялістышэ фольксгемейншафт».

У заключэнне абвінавачэння акт прыводзіць спіс абвінавачаных. У спісе: Засс з 34 членамі яго партыі і Нейман з 93 членамі сваёй партыі. Абвінавачваюцца яны ў прыналежнасці да сакретных нацыянал-соцыялістскіх арганізацый, якія дзейнічалі на падставе дырэктыў, атрымліваемых з Германіі, і ставілі сабе мэтай адрыў тэрыторыі Клайпеды ад Літвы і далучэнне яе да Германіі шляхам узброенага паўстання.

Акрамя таго, у спісе фігуруюць 7 чалавек па абвінавачэнню ў забойстве Ісэуціса і тры чалавекі, якія рабілі замах на жыццё Лаопса з помсты на палітычных меркаваннях».

„МАРАЛЬНАЕ НАСТУПЛЕННЕ ФАШЫСТАЎ"

ЛОНДАН, 21 снежня. (БЕЛТА). Берлінскі карэспандэнт «Таймс» паведамляе, што ў Берліне арыштавана 300 чалавек. Гэтымі арыштамі, паводле слоў карэспандэнта, як піша, заканчваецца «маральнае наступленне». Сярод арыштаваных ёсць лідэры нацыянал-соцыялістскай моладзі. Берлінскі карэспандэнт «Дэйлі тэлеграф» паведамляе, што расказаўшы пачуткі аб нязгодным устараненні са свайго поста міністра земляробства Дарэ. Яго функцыі выконвае зараз Шахт. Паводле слоў карэспандэнта, калі будзе аб'яўлена аб адстаўцы Дарэ, то гэта не выкліча вялікага здзіўлення, бо Дарэ лічаць радыкалам і да яго варожа адносіцца «ўсемагутны Шахт».

Па Совецкай Беларусі

МЕНСКІ РАЕН ВЫКАНАЎ ПЛАН МАБІЛІЗАЦЫІ СРОДКАЎ IV КВАРТАЛА

ЦК КП(б)Б — т. ГІКАЛО,
ЦВК — т. ЧАРВЯКОВУ,
СНК — т. ГАЛАДЗЕДУ,
НКФ — т. ХАЦКЕВІЧУ,
РЭДАКЦЫЯМ ГАЗЕТ «ЗВЯЗДА» І «РАБОЧИЙ».

На аснове мабілізацыі прадоўных мас горада і раёна, павышаючы якасць усёй фінансавай работы за права рапарту з'ездам советаў і т. Молатаву, г. Менск і раён план мабілізацыі сродкаў IV квартала на 20 снежня выканалі на 101,1 проц. Гадавы план выкананы на 114 проц.

САКРАТАР ГАРКОМА РЫСКІН.
СТАРШЫНЯ ГОРСОВЕТА ЖУКОВІЧ.
СТАРШЫНЯ ОРГБЮРО РВК ЖАРЫН.
ЗАГАДЧЫК ГАРФА ЗАЛЕСКІ.

НОВЫЯ КАЛГАСНЫЯ КЛУБЫ

У бягучым годзе ў калгасах Менскага раёна — «Комсамолец», імя Кавалерыйскага корпуса і іншых — пабудаваны чатыры новыя клубы. Кожны з іх разлічан на 200-250 чалавек. Абсталяваны новыя хаты-чытальні ў Ратамскім, Строчыцкім і Папярнянскім сельсоветах.

Ратамская хата-чытальня мае раёль, радыёўдыторыю, гледзельную залу на 250 чалавек і два пакоі для гурткоўай работы. Сёння ў Ратамцы пачынаецца сельсоветская алімпіяда самадзейнага мастацтва.

У 1935 годзе кожны калгас Менскага раёна будзе мець свой клуб або хату-чытальню.

ЗАКРЫЦЦЕ АРШАНСКАГА РАЕННАГА З'ЕЗДА СОВЕТАЎ

ОРША. (Па тэлефону).

Закончыў сваю работу VII з'езд советаў. З'езд выбраў райвыканком у складзе 71 члена і 25 кандыдатаў. У складзе делегацыі на XI усебеларускі з'езд советаў т.т. Чарнушэвіч (НКАсветы), Шастакоў («Калгаснік Беларусі»), Кудзелька (Верхсуд), Крапіва (саюз пісьменнікаў), Сосскін, Міцькоў і інш.

З'езд пастанавіў увекавечыць памяць С. М. Кірава — пабудаваць аэраклуб і арганізаваць звяно самалётаў імя Кірава. Асінторфу прысвоіць імя Кірава.

Пасля з'езда адбыўся арганізацыйны пленум РВК. Старшынёй РВК выбран т. Міцькоў.

РОБЕРМАН.

МАНАГРАФІІ АБ ВЫТВОРЧАСЦІ РУСКІХ ПІСЬМЕННІКАЎ

Інстытут літаратуры і мастацтва Беларускай Акадэміі Навук уключыў у план сваёй работы напісанне манаграфій аб творчасці рускіх совецкіх пісьменнікаў.

Першай выпускаецца манаграфія аб творчасці Марыеты Шагінян. Гэту работу падрыхтоўвае да друку навуковая работніца інстытута Філоўская.

РЭЧНЫ БАБЁР

Бабёр-ката капжтуны пушны звярок. Ён з'яўляецца адным з самых буйных грызуноў нашай фаўны і дасягае ў даўжыню аднаго метра пры вазе ў 30-35 кілограм. Раней гэты звярок быў надта шырока распаўсюджан як на тэрыторыі Совецкага Саюза, так і па-за яго межамі. Зараз-жа бабёр захаваўся толькі ў асобных мясцах нашага Саюза. Прычынай амаль поўнага знішчэння бабра з'яўляецца пагоня за яго цёплым і дарагім мехам, а таксама і за яго мускуснымі залозамі, вядомымі ў медыцыне пад назвай «бабровай струі».

У БССР бабры сканцэнтраваны галоўным чынам на рэчках Сож і Бярэза. Паасобнымі адзінкамі, па неправерэных даных бабры ёсць на некаторых прытоках Прыпяці і Заходняй Дзвіны. Па верхняму пячэнню Бярэзы ў 1924 г. у мэтах захавання бабра і іншых гаспадарчажарыскіх дзікіх жывёл і іх далейшага развядзення арганізован беларускі дзяржаўны паляўнічы запаведнік. У момант яго арганізацыі там была 21 бабровая хата і адна пара, а к восені 1933 г. лік хат узрос да 95 штук. Прычым з іх жылёвых хат 72 і нежылёвых 23.

Другая значная колькасць бабраў ёсць па рацэ Сож і яго прытоках. Але даных аб колькасці хат-нор і самі бабраў няма.

У мэтах далейшага росту колькасці бабраў трэба арганізаваць рад запаведнікаў каб стварыць сапраўдныя рассадзікі бабра для рассялення яго як па тэрыторыі БССР, так і ўсяго СССР. Неабходна пачаць работу па прыручэнню бабра. З гэтай мэтай, а таксама для высвятлення некаторых момантаў з біялогіі бабра, у гэтым годзе ў запаведніку арганізован бабровы тадаваннік.

З правядзеннем гэтых мерапрыемстваў мы будзем мець магчымасць у будучым выступіць на пушным рынку з новым і дарагім відам пушнины — бабром.

Старшы навуковы работнік Інстытута біялогіі БелАН СЯРЖАН.

АРХІТЭКТУРА, СУГУЧНАЯ ЭПОСЕ СОЦЫЯЛІЗМА

Архітэктура ў СССР пераживае ся ж сьмяшчэння з'езда архітэктараў, мы павінны выкарыстаць для сур'ёзнай і глыбокай вучобы мінулага архітэктурных эпох.

Мы павінны ўскрыць і вызначыць свае адносіны да розных архітэктурных стыляў—барока, готыкі, класікі і інш.

Мы павінны вызначыць і асудзіць тэндэнцыі архітэктурнага ўпрашчэнства і фармалізму і весці рашучую барацьбу з «дызайнерамі» і падобнага роду асцетызмам.

Шырока разгорнуўшы прадз'езданскую архітэктурна-творчую дыскусію, забяспечым высокі ідэйны змест нашай работы.

Першая беларуская архітэктурная нарада, якая ўчора пачала сваю работу, пакладзе арганізацыйны пачатак стварэнню свайго саюза совецкіх архітэктараў БССР і намеціць шляхі развіцця нацыянальнай па форме, соцыялістычнай па зместу архітэктуры.

Разгортваючы творчую работу, беларускія архітэктары прыдуць к 1-му ўсесаюзнаму архітэктурнаму з'езду ўзброеным высокім ідэйным зместам работ.

Пад кіраўніцтвам комуністычнай партыі, яе Цэнтральнага Камітэта і любімага правадыра, задчага соцыялістычнага грамадства таварыша Сталіна створым нашу совецкую соцыялістычную архітэктуру.

Архітэктар Е. Г. ВЕЙС,
прадстаўнік Усесаюзнага аргкамітэта саюза совецкіх архітэктараў.

Нарада заслухае даклад тав. Войнава аб выніках усесаюзнай нарады архітэктараў і даклад тав. Сукоўскага аб падрыхтоўцы да з'езду архітэктараў СССР і БССР, пасля чаго будзе выбран аргкамітэт архітэктараў БССР.

З прывітаннем ад імя ЦК КП(б)Б выступіў тав. Конін. Нараду вітаў тав. Вейс (прадстаўнік усесаюзнага аргкамітэта) і ад СНК БССР тав. Балдін (намкомлёгпромам БССР).

На вечарнім пасяджэнні нарады заслухана даклад тав. Войнава.

Учора ўвечары ў памяшканні Дома пісьменніка адкрылася першая ўсебеларуская нарада архітэктараў. У прэзідыум нарады выбраны тт. Конін, Сакалін, Рыскін, Амбражунас, Балдін, Вейс (прадстаўнікі усесаюзнага аргкамітэта саюза совецкіх архітэктараў), Войнаў, Гай дукевіч, Кірык, Кірпенко, (архітэктары), Ханін (інжынер).

Удзельнікі нарад уставаннем ушанавалі памяць таварыша Кірава.

У ганаровы прэзідыум выбраны т. Сталін і палітбюро ЦК ВКП(б), тт. Жданаў, Гікало, Тальман, Горкі і Ленскі.

ЗАКРЫЎСЯ З'ЕЗД СОВЕТАЎ ЯЎРЭЙСКАЙ АЎТАНОМНАЙ ВОБЛАСЦІ

БІРАБІДЖАН, 22 снежня. (Па тэлеграфу ад карэспандэнта «Звязды»).

21 снежня закрыўся з'езд советаў Яўрэйскай аўтаномнай вобласці.

Старшынём аблвыканкома выбран тав. Ліберберг.

БРЫН.

У НАРОДНЫМ КАМІСАРЫЯЦЕ УНУТРАНЫХ СПРАЎ СССР

Атрыма особ, прыцягнутых к суду па справе Нікалаева (забойства тав. Кірава) органамі Наркамата Унутраных спраў арыштаваны ў сувязі з гэтаю справаю ў Маскве 18 снежня г. г. наступныя ўдзельнікі былой зіноўеўскай антысавецкай групы: ШАРАЎ Я. В., КУКЛІН А. С., ФАЙВІЛОВІЧ Л. Я., БАКАЕЎ І. П., ВАРДЗІН І. В., ЗАЛУЦКІ П. А., ГАРШОНІН І. С., ЗІНОЎЕЎ Г. Е., БУЛАХ В. С., ГЕРЦЫК А. М., ЕЎДАКІМАЎ Г. Е., КАМЕНЕЎ Л. Б., ФЕДАРАЎ Г. Ф., КОСЦІНА А. П., САФАРАЎ Г. І.

З іх справы: ФЕДАРАВА Г. Ф., САФАРАВА Г. І., ЗІНОЎЕВА Г. Е., ВАРДЗІНА І. В., КАМЕНЕВА Л. Б., ЗАЛУЦКАГА П. А., ЕЎДАКІМАВА Г. Е., у адносінах якіх следства ўстанавіла адсутнасць дастатковых даных для аддання іх суду, — перададзены на разгляд особай нарады пры Наркамаце Унутраных спраў для ссылкі іх у адміністрацыйным парадку. У адносінах астатніх арыштаваных следства прадаўжаецца.

(БЕЛТА).

АДКРЫЛАСЯ НАРАДА ПА АСВАЕННЮ НОВЫХ ЗЕМЕЛЬ

22 снежня ў Акадэміі навук адкрылася ўсебеларуская нарада, прысвечаная праблемам асваення новых земель і палепшэння сенажацяў. У рабоце нарады прымаюць удзел акадэмікі Кедраў-Зіхман, Лубна, праф. Тімірязеўскай с.-г. акадэміі Чмыхоўскі, праф. Афанасьеў, прадстаўнікі Дзяржплана, Наркамзема, глебулова-даследчых інстытутаў, а таксама перадавых МТС і калгасаў. Будзе заслухана 10-12 даклядаў.

ПАВЕДАМЛЕННЕ

24 снежня, у 7 гадзін вечара, у памяшканні Дома партактыву (малая зала) для трыкутнікаў прадпрыемстваў і прапагандыстаў гор. Менска ўпаўнаважаным Наркамата замежных спраў у БССР графскім КАРТАШОВЫМ будзе прачытан даклад на тэму «Аб міжнародным становішчы».

Трыкутнікі прадпрыемстваў уваходзяць па атрыманых білетах і партбілетах, а прапагандысты па сваіх пасведчаннях. Білеты атрымаць у пакоі № 22.

Дом партактыву пры ГК КП(б)Б.

Адказны рэдактар Н. ЛЕНЦНЕР.

Рэпертуар БДТ—1 Беларускі тэатр Оперы і Балета
Гал. 24905
Мастацкі кіраўнік І. А. ГІТГАРЦ
Сёння 23 снежня
КНЯЗЬ ІГАР
Пачатак у 8 гадз. вечара.
Яшчэ ўмешчаюцца білеты ў касе тэатра 12—2 і з 5—8 гадз. веч.

Гукавы кіно-тэатр „Чырвоная Зорка"
Вялікі зменны ... у праграме гукавы Саюз кіно-журнал XVII Окцябр у Маскве.

Гукавы кіно-тэатр „Пралетарый"
Самая весёлая камедыя Наследны прынц рэспублікі

Кіно „Інтернацыянал"
Ад 20 снежня новая праграма

Кіно „СПАРТАК"
ЗА ШТО ЯЕ СУДЗІЛІ (ТАМІЛІ)
драма ў 6 частках

НДІ школьнай педагогікі
АРГАНІЗУЕ СЁННЯ
23 снежня ў 8 гадзін у зале пед. інстытута (былы політэхнічны інстытут)
ЛЕКЦЫЮ
дырэктара Маскоўскага псіхалагічнага інстытута праф. КАЛБАНОЎСКАГА
на тэму:
„ТЭМПЕРАМЕНТ І ХАРАКТАР"
Пасля лекцыі адказы на пытанні.
Запрашаюцца НАСТАЎНІКІ школ г. Менска.
ДЫРЭКЦЫЯ.

КІРАЎНІЦТВА ДОБРАБЫТУ МЕНГОРСОВЕТА
просіць насельніцтва, загадчыкаў домамі, дворнікаў пры заўважанні наспраўнасці, або негарання
ВУЛІЧНЫХ ЛІХТАРОЎ
(ПРАЖЭКТАРАЎ)
паведаміць па тэлефону № 20694 (ЦЭС)
АДМІНІСТРАЦЫЯ.

Друкарні газ. „ЗВЯЗДА"
ПАТРЭБНЫ ПАДЧЫТЧЫКІ
звяртацца да дырэктара друкарні Совецкая, 83, другі паверх.

ПАРТВЫДАВЕЦТВА ЦК КП(б)Б
ВЫХОДЗЯЦЬ З ДРУКУ і рассылаюцца па кнігарням БАКТ'а і ДВБ
Выбраныя творы В. І. ЛЕНІНА ў двухтомах, на беларускай мове (двухтомнік).
Тыраж 15.000. Ц. аднаго тома 3 р. 50 к., перапл. 1 руб.
Цана двухтомніка—9 руб.
ЗАЯЎКІ І ЗАКАЗЫ на двухтомнік прымаюцца ва ўсіх кнігарнях БАКТ'а і ДВБ, а таксама ў магазіне Партвыдавецтва (Совецкая, 61).

ЦСПСБ і фінсекцыя гарсовета
ПРАПАНУЮЦЬ усім вылучаным таварышам для праверкі правільнасці вылічэння падаходнага падатку і культзбору
закончыць праверку і прадстаўленне актаў у гарфа
НЕ ПАЗНЕЙ 25 СНЕЖНЯ,
Фабзаўмясцкомам праверыць выкананне ў вызначаны тэрмін,
ЦСПСБ, Фінсекцыя.

Кіраўніцтва мастацтваў Наркомасветы БССР
АБ'ЯЎЛЯЕ, што
тэрмін падачы рукапісаў на конкурс п'ес
для клубнай гарадской і калгаснай сцэны
працягнут да 1 студзеня 1935 г.
Кіраўніцтва мастацтваў НК АСВЕТЫ.

ПАДПІСВАЙЦЕСЯ на 1935 год
на газету
ЗВЯЗДА
Орган ЦК і МК КП(б)Б, ЦВК і СНК БССР.
УМОВЫ ПАДПІСКІ: на 1 м.—2 р. 50 к. на 3 м.—7 р. 50 к. | на 6 м.—15 р. на 1 г.—30 р.
Падпіска прымаецца: горбюро Саюздрука, агенцтвамі сувязі і газетаносцамі.
Здавайце падпіску своечасова не пазней 23 снежня і на больш доўгі тэрмін.
Памятайце, што доўга тэрміновая і своечасовая падпіска забяспечвае рэгулярную і своечасовую дастаўку газеты.

ТАБЛІЦА 16 тыража выйгрышаў пазыкі „ПЯЦІГОДКА У ЧАТЫРЫ ГАДЫ" і „3 ПАЗЫКІ ІНДУСТРЫЯЛІЗАЦЫІ".

Тыраж адбыўся ў г. Благавешчанску 25—28 лістапада 1934 г.

Бяспроцантна-выйгрышны выпуск.

а) Выйгрышы па 200 руб. выпалі на аблігацыі наступных серый бяспроцантна-выйгрышнага выпуску.

НУМАРЫ СЕРЫЙ.

00029	08362	18865	31934	43709	52167п	61332	69466*)	79633	91314
00045	08670	19108	31970	43727	52221	61338	69732	79713	91539
00308	08697	19399	32287	43730	52424*)	61564	69764	79850	91761
00614т	08699	19927	32352т	43986	52797	61578	69922	80173	91864
00785	09039	19939	32409	44019	53167	61631	70057	80414	91986
00874	09398п*)	20061	32418	44063	53388п	62075	70140	80463	92101
01016	09450	20210	32625	44837	53603	62123	70156	80496	92114*)
01104	09861	20624	33135	45200	54035	62155*)	70175	81197	92188п
01107	10170	21052*)	33399	45232*)	54200	62245	70244	81355	92384
01399	10588	21097	33515	45361	54305*)	62294	70335	81374	92542
01413	10698	21178	33760	45423	54335	62353	70368	81906	92618
01516	10838	21182	33847	45569	54419	62396	70445	82229	92855
01522	11007	21769	33913	45662т	54553	62402	70645	82493	93032
01589	11198т	21884*)	34224	45860	54651	62468	70816	82690	93181
01660	11397	22102	34240	45980	54668	62481	70854	83049	9 195
01843	11467	22329	34515	46052	54872	62583	71253	83129	93815
01910	11757	22624	34693	46158	55078	62716	71503	83375	940 5
02457	11789	22930	34706	46435	55204	62774	71637	84050	94405
02703	12095	22939	34842	46607	55291	62974	71682	84092	94495
02759	12348	23781т	35115	46911	55505	62989	71886	84103	94645
02888	12365	24008	35116	47052	55871	63629	71902	84107	94752
02946	12449	24031	35213	47098	55915	63681	72108	84262	94805
03040	12504	24179	35350	47149	55975	64157	72233	84281	95018
03057	12529	24674	35918	47219	56290*)	64276	72456	84400	95073*)
03168	13180	24834	36208	47334	56518	64350	72874	84427*)	95376
03519	13220	25130	36390	47633	56650	64376	73244	84776	95485
03544	13307	25187	36421	47779	56760*)	64520	73562	85091	95594
03670	13500	25270	36653	48009	56846	64594	73667	85158	96213
03855	13615	25319	36746	48260	56990	64928	73674	85340	96467
03956	13621	25660	36900	48437	57005	65056п	74037	85685	96743
04091	13684	25664	36903	48671	57280	65116	74405	86093	96752
04164	13825	25834	37841	48678*)	57369	65223	75148	86425	96761
04417	14329	25852*)	37883	48919	57375	65521	75226	86489	96846
04598	14454	26017	38184	48978	57799	65702	75285	86597	96847
04700	14602	26447	38208	49001	57851	65827	75436	86645	96996
04724	14701т*)	26476	38749	49179т	57907	65990	75468	86982	97009
05105	14972	26872	38951	49312	58167	66012	75555	87015	97146
05347	15051	27091	39155	49452	58169	66047	75676п	87366	97402
05402	15237*)	27140	39865т	49533	58277	66247	75702	87397	97631
05532	15385	27150п	40267	49739	58381п	66637	76148	87751	97634
05639	15432	27237	40387	49846	58557	66741	76334	87775т	97674
05640	15615	27845	40438	49887	58590т*)	66752	76472	88012	98280
05708	15645т	27977	40479*)	50090	58732	66760	76543	88230	98298
06201	15717	28307	41013п*)	50151	59023	66858	76677	88391	98350
06280	15779	28575	41087	50160	59362	67258	76688	88756	98714
06375	15823	28681	41311	50502	59574	67342	76925	88768	98919
06403	15877	29098	41353	50602	59572	67463	77120*)	88802	98974
06576	16027	29276п	41760	51089	59713	67551	77272	88957	99015
06724	16438	29669	41902*)	51141	59835	67615*)	77290	88963	99068
06835	16589	29803	42109	51208п	59890т	67921	77679	89120	99544
06899	16736	29879	42193	51220	59895	68048*)	77718	89131	99575
07025	16855	30461	42211	51389	59947	68227	77955	89170	99639
07176	16882	30554	42244	51397	60112	68310п	78142	89232п	99747
07244	17147	30578	42247	51399	60167	68476	78153	89741	99895
07595	17327	30734	42582	51416	60523	68595	78415	90223	99906
07605	17340	30796	42629	51857	60729	68507	78777	90487	—
07767	17526	30869п	42954	51927	60818	68814	78970	90746	—
07804	17861	30974	43167	51951	61026	68877	79292	90861	—
07993	18231	31220	43295	52080	61077	68879	79297	91051	—
08286	18520	31624т	43303	52163	61246	69312т	79455	91247	—

Б. Выйгрышы па 1000 і 5000 руб. выпалі на наступныя нумары серый і аблігацый бяспроцантна-выйгрышнага выпуску.

№ № серый.	№ № аблігацый.	Размер выйгрыша.	№ № серый.	№ № аблігацый.	Размер выйгрыша.	№ № серый.	№ № аблігацый.	Размер выйгрыша.	№ № серый.	№ № аблігацый.	Размер выйгрыша.
09398п	10	1000	40479	03	1000	54305	03	1000	68048	04	1000
14701т	01	1000	41013п	01	1000	56290	02	1000	69466	06	1000
15237	02	1000	41902	04	1000	56760	05	1000	77120	02	1000
21052	01	1000	45232	02	1000	58590т	10	1000	84427	06	10 0
21884	03	1000	48678	08	1000	62155	01	1000	92114	06	5000
25852	07	5000	52424	05	1000	67615	06	1000	95073	01	1000

Кіраўніцтва ашчаднасамі і Дзяржпрэдпрыемствамі БССР.

ДЗЯРЖАЎНАЕ ВЫДАВЕЦТВА БЕЛАРУСІ
Сектар кнігагандлю
ПАДПІСВАЙЦЕСЯ НА 1935 г. НА ПЯЦІДЗЁННУЮ ГАЗЕТУ
„ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА"
органы правлення саюза совецкіх пісьменнікаў і кіраўніцтва Галоўмасветы Наркомасветы БССР.
„ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА" з'яўляецца кіруючым органам па пытаннях літаратуры, выяўленчага і тэатральнага мастацтва, музыкі, драматургіі, кінадрамаургіі, крытыкі мовы, фальклёра.
ПАДПІСНАЯ ЦАНА:
На год (72 нумары)—14 р. 40 к. | На 3 мес. (18 нумароў)—3 р. 60 к.
„ 6 мес. (36 нумароў)— 7 р. 20 к. | „ 1 мес. (6 нумароў)—1 р. 20 к.
Кошт асобнага нумара 20 кап.
ПАДПІСКА прымаецца ўсімі аддаленнямі Саюздрука, на пошце пісьменосцамі.

НАРКОМУНУТГАНДАЛЬ РСФСР
Дзярж. кантора пасылачн. гандлю «ПОСЫЛГОСТОРГ»
Масква, Мясніцкая, 47/131.

«ПОСЫЛГОСТОРГ» высылае пасылкі па пошце і чыгунцы ў любы пункт Саюза індывідуальным заказчыкам, арганізацыям (акрамя гандлёвых) і калектывам.

1. ПРАДМЕТЫ САНІТАРЫІ І ГІГІЕНЫ.

Аптечка першай дапамогі ў фанерным чамадане з термометрам — 33 р. 65 коп., без термометра — 30 р. 25 к. Аптечка хатняя — 7 р. 80 к. Апарат для знішчэння мазалей (даз волена Лен. абл. аддзелам аховы здароўя) — 2 р. 50 к. Брытвы звычайныя (Мосштамп) I гатунак — 10 р. 75 к., II гатунак — 8 р. 60 к. Брытвы Прафлоўскія. I гатунак — 6 р. 20 к., II гатунак — 5 р. 41 к. Прыбор для галення нікелеваны і алюмінёвы, тры рэчы, — ад 14 р. і дарожкой. Кісці для галення ад 2 р. 50 к. да 8 р. Аселок для шрыфту брытв ад 1 р. 57 к. Мацынка для стрыжкі валос (інтом) № 1, I-ы гатунак, латун. — 14 р. 08 к. Інтом — № 1, II гатунак — 13 р. 68 к. Брытвы бяспасныя (Мосштамп) нікелеваныя, у алюмінёвым футляры, I гатунак — 8 р. 17 к. Лёзы «Стандарт» для бяспасных брытв — 33 к. шт. Лёзы «Інтом»—24 коп. шт.

2. ПРЫЛАДЫ ДЛЯ ГРЫМАВАННЯ.

Грым тэатральны, вялік. скрынка — 4 р. 50 к. Гумоз для носа — 65 к. Лак для наклейкі валос — 1 р. 60 к. флакон. Румяны сухія — 1 р. 35 к. каробка. Алоўкі для брывей ад 1 р. 30 к. Губная памада — 5 р. 67 коп. Паста для знятня грыму — 2 р. 45 к. каробка. Вазелін рускі — 60 к. каробка. Растушоўка — 10 к. Крэпе розных колераў — 2 р. метр. Вусы ад 1 р. 20 к. Бароды з вусамі ад 5 р. да 10 р. Парыкі розныя, мужчынскія і жаночыя, — ад 24 р. да 125 р. Пудра тэатральная 4 р. 40 к. каробка.

3. ПАРФЮМЕРЫЯ І КАСМЕТЫКА ТЭЖ

Туалетнае мыла выш. гатунку ад 2 р. 43 к., вадкае туалетнае мыла ад 3 р. 29 к. Одэкалон гігіенічны ад 3 р. 54 к. Одэкалон пяточны ад 3 р. 29 к. да 9 р. 01 к. Духі ад 2 р. 43 к. да 17 р. 92 к. (пры адсутнасці патрабуемага паху—аставляем за сабой права замены яго іншым пахам). Розныя кремы ад 3 р. 03 к. да 6 р. 71 к. і інш.

СЮРПРЫЗНЫЯ КАРОБКІ. «Сада»—44 р. 05 к. «Сада-Яко»—52 р. 60 к., «Новая зара» 60 р. 10 к., «Камелія»—75 р. 15 к.

Тавары высылаюцца на суму не менш 7 руб.

У паказаных цэны ўключаны кошт упакоўкі і перасылкі.

Цэны на тавары, адпраўляемыя ў далёкія акраіны Саюза, дадаткова на 5 проц.

Заказы арганізацый выконваюцца ў тэрмін ад 10 да 25 дзён з дня атрымання Посылгосторгом 50 проц. кошту заказанага тавару, індывідуальных-жа заказчыкаў—па атрыманні ўсяго кошту.

Заказы і грошы накіроўвайце па адр.: Масква, Мясніцкая, 47-131 Посылгосторгу. Разліковы рахунак у Маск. абл. канторы Дзяржбанка № 6757.

Патрабуйце нашы каталагі: па музыцы, фото, радыё, спорту, метала-тасн. прадметах, галантарэі, друкарскіх выданнях, канц. таварах і наглядных дапаможніках.

Каталаг высылаюцца па атрыманні 20 к. паштовымі маркамі.

Выпускаючы — КРУЧКОЎ, ст. мастак — БЯРОЗАВІК ст. матэрыялы — ПЕРАКЛАДНЕЎ, ст. стаматыпір—ПЕДЗІК, ст. друкар АНУЧЫН. Тыраж 85.000 Уп. Галоўлітбела № К—6334.

Мінск, друкарня «Звязды».